Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
30 ЛІСТАПАДА 2016 г. СЕРАДА № 231 (28341)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Пісьменніцкі форум

СТАР. 2



Як захаваць дужы пол?

СТАР. 5



Легенды спорту: Вольга Назарава

СТАР. 6

## ДАМОЎЛЕНАСЦІ ЁСЦЬ. ЧАС ДЗЕЙНІЧАЦЬ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на другі дзень свайго афіцыйнага візіту ў Азербайджан на сустрэчы з прэм'ер-міністрам гэтай краіны Артурам Расі-задэ абмеркаваў перспектывы развіцця беларуска-азербайджанскіх адносін.**

Асаблівая ўвага была звернута на рэалізацыю дамоўленасцей, дасягнутых напярэдадні ў час афіцыйных перагавораў прэзідэнтаў Беларусі і Азербайджана, паведамляе БЕЛТА. Як ужо пісала «Звязда», па выніках перагавораў Аляксандра Лукашэнкі і Ільхама Аліева падпісаны пакет дакументаў аб развіцці ўзаемадзеяння. Сярод іх — праграмы па развіцці супрацоўніцтва ў сферы спорту, адукацыі і аграпрамысловага комплексу, план мерапрыемстваў па выкананні праграмы сацыяльна-эканамічнага супрацоўніцтва да 2025 года, пагадненне аб усталяванні міжрэгіянальных сувязяў паміж Гродна і выканаўчай уладай Габалінскага раёна і іншыя дакументы.

Аляксандр Лукашэнка перад сустрэчай з Артурам Расі-задэ наведаў Цэнтр Гейдара Аліева, які быў створаны ўказам Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева і адкрыты ў 2012 годзе. Таксама Прэзідэнт Беларусі ўсклаў вянок да магілы Гейдара Аліева і да манумента на Алеі шахідаў.

Учора афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Азербайджан завяршыўся.

## ГРЭЭ СЭРЦЫ СВЯТАЯ КРЫНІЦА...




Святая крыніца, названая ў гонар Іаана Хрысціцеля, якая знаходзіцца на памежжы двух раёнаў Віцебшчыны — Мёрскага і Глыбоцкага, упарадкаваная круглы год. А ўсё таму, што ў крыніцы ёсць надзейны захавальнік — Алег ВАЙЦЯХОВІЧ — жыхар вёскі Язна. У свой час Алег спраектаваў і ўзвёў афармленне крынічнага калодзежа, прывёў тэрыторыю комплексу ў належны стан, зрабіў купель. А нядаўна пабудаваў памяшканне для пераапранання і накрыў купель дахам.

Раз на тыдзень ён наведвае крыніцу. У гэтыя снежныя дні мне давялося сустрэць неабыякавага язненца ў гэтым прыгожым кутку з венікам і лапатай. Побач з Алегам быў і яго малады аднавясковец Вадзім ЧАРНЯЎСКІ *(на фота)*. Яны старанна прыбіралі снег, які паспеў добра засыпаць наваколле.

— Наведвальнікі прыходзяць і прыязджаюць на гэта месца кожны дзень, не зважаючы на надвор'е. З благаславення настаяцеля прыхода я ўзяў на сябе асноўны клопат пра крыніцу. Але без падтрымкі маіх землякоў крыніца, без перабольшвання, не была б такой прыгожай і адметнай, — кажа Алег Вайцяховіч. Захавальнік Янаўскай крыніцы добрым словам згадвае людзей, якія ахвяравалі сродкі на яе добраўпарадкаванне, на набыццё будаўнічых матэрыялаў. Напрыклад, былую жыхарку Язна Таццяну Шчарбіцкую — на яе грошы ўзведзены сцены і дах купелі.

— Крыніца святога Яна грэе сэрцы маіх землякоў, як бы далёка яны ні жылі, — перакананы Алег Вайцяховіч.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«Інфляцыя ў Беларусі ў 2016 годзе будзе ўтрымлівацца ў прагназуемых параметрах. У краіне захавана макраэканамічная стабілізацыя. Урад і Нацыянальны банк своечасова разлічваюцца па знешніх даўгах. Працягваецца работа з Міжнародным валютным фондам па магчымай праграме з Беларуссю. Нагадаю, што стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка зніжалася ў 2016 годзе тройчы. Гэта вельмі важны фактар, каб стварыць падмурак для эканамічнага росту ў наступным годзе».*

### • ВАЖНА

**Базавая велічыня з 1 студзеня 2017 года складзе 23 беларускія рублі.**

Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 28 лістапада 2016 года №974, паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада. Сёння, згодна з Указам Прэзідэнта ад 4 лістапада 2015 года №450 «Аб правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь» і з пастановай урада ад 27 чэрвеня 2016 года №496, базавая велічыня складае 21 беларускі рубель.

## НА МОВЕ ДЫПЛАМАТЫІ

### Мінск стаў пляцоўкай для перагавораў кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў «нармандскай чацвёркі»



**Учора ў мінскім «Прэзідэнт-атэлі» міністры замежных спраў Расіі, Украіны, Германіі і Францыі Сяргей Лаўроў, Павел Клімкін, Франк-Вальтэр Штайнмаер і Жан-Марк Эйро сабраліся, каб абмеркаваць надзённыя пытанні ўрэгулявання сітуацыі на паўднёвым усходзе Украіны.**

На сустрэчы ў Берліне 19 кастрычніка лідары «нармандскай чацвёркі» далі даручэнне падрыхтаваць дарожную карту гэтага ўрэгулявання, і яшчэ перад пачаткам сустрэчы кіраўнікоў МЗС у Мінску многія аналітыкі меркавалі, што менавіта аб ёй будзе ісці размова дыпламатаў.

Раней кіраўнік МЗС Расіі Сяргей Лаўроў адзначаў, што, у адпаведнасці з берлінскімі дамоўленасцямі, у аснове дарожнай карты павінен быць прынцып «сінхроннасці дзеянняў у сферы забеспячэння бяспекі і пашырэння палітычных рэформ» у рамках мінскіх дамоўленасцей ад 12 лютага 2015 года. У сваю чаргу міністр замежных спраў Украіны Павел Клімкін напярэдадні сустрэчы ў Мінску расказаў аб намеры ўкраінскага боку прадставіць свой варыянт дарожнай карты выканання мінскіх пагадненняў. Асноўныя акцэнты ў ім — на пытаннях бяспекі і гуманітарнага характару. Выступаючы ўчора перад самым прыездам у Мінск на Берлінскім форуме па знешняй палітыцы, міністр замежных спраў Германіі Франк-Вальтэр Штайнмаер заявіў, што работа над рэалізацыяй дамоўленасцей па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне ідзе марудна, аднак, нягледзячы на ўсе складанасці, яна павінна быць прадоўжана. «Усё гэта (розныя аспекты работы над «Мінскам») складана, але, па маім вопыце, у нас няма іншай магчымасці, акрамя як прысвяціць сябе вырашэнню гэтых складанасцей», — сказаў кіраўнік МЗС Германіі.

Прарываў не было, але дамоўленасці лідараў «нармандскай чацвёркі» не падвяргаюцца сумненню, пракаментаваў учарашнія перамовы Сяргей Лаўроў.

Учора па ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне быў зроблены яшчэ адзін крок. Зроблены ён быў у Мінску, і гэта добрая нагода нам усім узгадаць пра тое, што ў шалёным сучасным свеце мы маем найвялікшую каштоўнасць — спакой і мір у сваёй краіне.

■ Варта пераймання

## ЯК РАМОНТ УПЛЫВАЕ НА... ДЭМАГРАФІЮ

### У аднаўленую радзільню Салігорска едуць парадзіхі з 8 суседніх раёнаў Міншчыны

**Да радзільнага аддзялення Салігорскай цэнтральнай раённай бальніцы штодзень прыходзяць шчаслівыя бацькі, каб падтрымаць сваіх жонак, якія нарадзілі немаўлят. «А самыя смелыя з мужчын ладзяць перад вокнамі сапраўднае шоу», — смяецца галоўны ўрач Вольга БЕЛАВУС.**

Дзмітрыя Сляпцова мы засталі за развешваннем рознакаляровых шароў на галінках дрэва. Мужчына быў так заняты справай, што нават не заўважыў, як да яго падышлі. І спахапіўся толькі, калі ўбачыў у руках карэспандэнта фотаапарат.

— Сёння ноччу жонка Марыя нарадзіла мне дачушку. Усю ноч не спаў, хваляваўся, — растлумачыў свае дзеянні Дзмітрый. — Мая каханая адчувае сябе добра, вунь стаіць каля акна, махае мне рукой. Дачку пакуль не бачыў, але ведаю, што яна прыгожая, здаровая, моцная — вага 3 кілаграмы 980 грамаў, рост 53 сантыметры. Наогул я ўжо двойчы бацька, старэйшая — таксама дзяўчынка.

Дзмітрый працуе ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Беларуськалій», зарплата нядрэнная, але пакуль муж з жонкай жывуць з бацькамі. Мужчына спадзяецца, што з цягам часу яны прыдбаюць сваю кватэру і тады запланнуюць трэцяе дзіця. Тым больш што для парадзіх у Салігорску створаны вельмі добрыя ўмовы.

1 верасня ў горадзе адкрылася першая чарга абноўленага радзільнага аддзялення. Асаблівасць рамонту заключалася ў тым, што ён вёўся на працягу года, а ўрачы аднachасова прымалі роды ў пацыентак. Падчас рэканструкцыі не спынялася і работа перынатальнага цэнтра, куды паступаюць жанчыны з дачаснымі родамі і шматплоднай цяжарнасцю. Гэта не толькі жыхаркі Салігорска, але і 8 суседніх раёнаў Міншчыны.

— Мы правялі не толькі рамонт і мадэрнізацыю, але і закупілі новае абсталяванне: апарат ультрагукавога абследавання, які дазваляе на месцы літаральна за 2 хвіліны абследаваць маці і дзіця, — кажа **загадчык аддзялення для цяжарных і парадзіх Салігорскай бальніцы Іван КАЛУПАНОВІЧ**. — Набылі і вакуумнае абсталяванне, апарат для размарожвання плазмы крыві, 4 апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх, ложкі, якія можна падабраць індывідуальна для кожнай жанчыны, транспартныя кюветы для неданошаных дзяцей.

СТАР. 3

■ «Звязда» даследуе праблему

## ЗАБЫЦЬ, КАБ ВЫРАТАВАЦЬ

### Развейваем міфы пра наркаманію

**Таблеткі ад наркаманіі не існуе. Але выратаваць блізкіх з гэтай бяды можна. Трэба толькі ведаць, як гэта рабіць. На жаль, сёння існуе шмат міфаў, звязаных з такой бядой. Самыя распаўсюджаныя — што наркаманія не захворванне, а разбэшчанасць, злачынны лад жыцця і што гэта праблема, з якой можна разабрацца самастойна. Зыходзячы з гэтага прымаюць не тыя меры. Нават самыя блізкія людзі сваімі дзеяннямі хутчэй шкодзяць, чым дапамагаюць...**

**Існуюць праграмы, якія дазволілі выратаваць ад залежнасці не адну сям'ю. Так, дапамога патрэбна не толькі таму, хто ўжывае наркотыкі, але і яго блізкім. Больш таго, выратаванне залежнага павінна пачынаецца менавіта з работы з яго бацькамі, упэўнены ў грамадскай арганізацыі «Маці супраць наркотыкаў».**

### НЕ КАРМІЦЕ!

Дрэнныя тыя бацькі, што не дакормяць сваіх дзяцей да пенсіі. Гэта самая небяспечная ўстаноўка ў нашым грамадстве. Уласна з яе часта і пачынаецца праблема залежнасці. Нярэдка бацькі, што звяртаюцца ў арганізацыю, каб дапамагчы свайму даросламу дзіцяці, прызнаюцца, што той цалкам на іх утрыманні. Пакуль ёсць нехта, хто корміць, залежны чалавек не кіне ні калоцца, ні піць. Яму ж камфортна. Калі бацькі працягнуць яго забяспечваць, можа дайсці да таго, што з часам самі пачнуць набываць залежнаму наркотыкі ці алкаголь.

Самы эфектыўны спосаб дапамагчы наркаману — перастаць клапаціцца пра яго, кантраляваць, высвятляць, дзе ён знаходзіцца. Гэта спрацоўвае таму, што многія залежныя развучыліся вырашаць свае праблемы і баяцца застацца са сваёй бядой, асабліва адзін на адзін.

СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У Бразіліі аб'яўлена жалоба па ахвярах авіякатастрофы

Улады Бразіліі абвясцілі трохдзённую жалобу ў сувязі з крушэннем самалёта, на борце якога ляцелі футбалісты бразільскай каманды «Шапекоэнсе».

Па апошняй інфармацыі, у авіякатастрофе выжылі шэсць чалавек. Усяго на борце знаходзіўся 81 чалавек. Ратавальнікі працягваюць аперацыю па пошуку тых, хто выжыў.

Самалёт з бразільскімі футбалістамі разбіўся ў Калумбіі. Раней паведамлялася, што прычынай авіякатастрофы маглі стаць непаладкі ў электраабсталяванні. Сярод іншых версій — дрэнныя ўмовы надвор'я і нястача паліва ў самалёце.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія Мішэлу Тэмеру, а таксама родным і блізкім загінулых у выніку крушэння самалёта. «У Беларусі з глыбокім болем успрынялі трагічную вестку аб шматлікіх чалавечых ахвярах, значную частку якіх склалі грамадзяне Бразіліі», — гаворыцца ў спачуванні.**

### У Ізраілі за тыдзень на пажарах пацярпелі 125 чалавек

У Ізраілі на пажарах за тыдзень пацярпелі 125 чалавек, паведамляецца ў справаздачы ізраільскай арганізацыі па аказанні дапамогі «Чырвоная Зорка Давіда». Пажары не спыняюцца ўжо тыдзень і ахапілі муніцыпальныя землі на плошчы 1130 гектараў. Акрамя гэтага, у горадзе Хайфа ў выніку пажару пашкоджана звыш 1780 будынкаў. Жыхароў, якія страцілі прытулак, часова размяшчаюць у гасцініцах горада. Нанесены пажарамі ўрон ацэньваецца амаль у $130 млн.

### У Японіі знішчаць звыш 300 тысяч курэй



Прычына — птушыны грып. Вірус H5N8 выяўлены на ферме ў мястэчку Сэкікава — тут напярэдадні былі знойдзены каля 40 мёртвых птушак, пры гэтым у пяці з іх быў вірус. Улады прэфектуры Ніігата прынялі рашэнне знішчыць каля 310 тысяч курэй. Выяўлены вірус і ў паўночнай прэфектуры Ааморы. Тут на адной з ферм знайшлі мёртвых качак. У радыусе 10 км ад ачагоў віруса размешчана больш за 60 фермерскіх гаспадарак амаль з мільёнам птушак. Японскі ўрад прымае экстранныя меры па вырашэнні сітуацыі — уводзіцца каранцін з мэтай пазбегнуць далейшага распаўсюджвання віруса.

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У Бельгіі «выгаранне на рабоце» прызналі захворваннем



Улады каралеўства афіцыйна прызналі «выгаранне на рабоце» (ад англійскага burn out — выгараць) захворваннем, звязаным з працоўнай дзейнасцю. Паводле дадзеных Бруселя, штогод з-за гэтай хваробы па медыцынскую дапамогу звяртаюцца да 10 тысяч чалавек. «Мы прызнаём «выгаранне» захворваннем, звязаным з работай, што дазволіць нам прыняць меры па яго прафілактыцы на працоўным месцы», — абвясціла ў эфіры тэлеканала VRT міністр аховы здароўя Бельгіі Магі Дэ Блок. Такім чынам, прызнанне «выгарання на рабоце» захворваннем дасць магчымасць павысіць да 70% суму кампенсацыі, якую выплочваюць страхавыя кампаніі за наведванне работнікамі ўрачоў. Бельгійскія эксперты неаднаразова адзначалі, што праблема псіхалагічнагаператамлення жыхароў на працы ў апошні час набыла пагрозлівыя маштабы. Паводле даных улад, больш за 8200 чалавек бралі адгулы ці адпачынак у мінулым годзе менавіта з-за «выгарання на рабоце», пісалі журналісты The Brussels Times.

### КОРАТКА

**Амаль 15 тыс. калядных і навагодніх выставак-продажаў і кірмашоў плануецца правесці ў Беларусі. З 20 снежня пачнуць работу больш за 800 ёлачных базараў (з іх 200 — у Мінску).**

Беларусь разглядае магчымасць пашырэння свайго дыппрадстаўніцтва ў Швецыі ў 2017 годзе. Цяпер там знаходзіцца часовы паверапы ў справах Беларусі. «Спадзяюся, што ў Швецыі будзе функцыянаваць паўнацэннае пасольства Беларусі. Гэта значыць — пасол, калі будзе адпаведнае рашэнне, і некалькі дыпламатаў», — паведаміла намеснік міністра замежных спраў Алена Купчына.

**Увайсці ў лік фіналістаў нацыянальнага адборачнага тура конкурсу песні «Еўрабачанне-2017» прэтэндуюць 67 выканаўцаў. Столькі заявак паступіла на адрас Белтэлерадыёкампаніі па стане на 29 лістапада. Сёння ў 12.00 у Белтэлерадыёкампаніі пачнецца праслухоўванне канкурсантаў.**

Трое жыхароў Брэсцкай вобласці патанулі ў лістападзе ў дамашніх ваннах. Ва ўсіх выпадках ахвярамі вады сталі пажылыя мужчыны. Ёсць падазрэнне, што ў двух з іх прычынай смерці магла стаць сардэчная недастатковасць.

**У рэйсавым аўтобусе Чарнігаў — Гомель пагранічны нарад сумесна з супрацоўнікамі Гомельскай мытні 28 лістапада выявіў груз, схаваны ад мытнага афармлення. Грамадзяне Украіны спрабавалі незаконна ўвезці ў Беларусь 52 кг сала і 10 купюрапрыёмнікаў для інфакіёскаў.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## ДОБРАЯ ЗВЫЧКА



**Вера Мікалаеўна ЖУКАВА, жыхарка райцэнтра Ушачы:**

— Я родам з вёскі Пуцілкавічы — малой радзімы Петруся Броўкі. Мо і дзякуючы гэтаму люблю беларускую мову, літаратуру. Спачатку «Звязду» выпісвала мая мама. А потым і я. Бывае, паквартальна не атрымаецца афармляць падпіску, дык на месяц выпісваю. А калі не выпішу і на месяц, бо перыядычна зусім цяжка з грашыма, на наступны — абавязкова! Без газеты ўжо не магу.

У «Звяздзе» мне падабаецца чытаць пра традыцыі беларусаў, цікавыя артыкулы пра тое, што адбываецца ў краіне і свеце. Я выгадавала сына, дачку, падрастаюць шасцёра ўнукаў: тры дзяўчынкі і тры хлопчыкі. Газета прывівае і ім павагу да роднай мовы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Ушацкі раён — Віцебск.*

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Парламенцкі дзённік

# АКАДЭМІЧНЫЯ АБМЕНЫ, АЛКАГОЛЬ І ЭКСПАРТ

## Якія новыя законапраекты прынялі ўчора дэпутаты?

**Захоўваць дома, а таксама перамяшчаць па тэрыторыі краіны алкаголь з акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь можна будзе ў любых аб'ёмах. Затое немаркіраваную спіртную прадукцыю перавозіць можна толькі ў аб'ёмах, якія не перавышаюць 5 літраў на фізічную асобу. Такія змены ў заканадаўства ўносіць Дэкрэт Прэзідэнта ад 8 лістапада «Аб перамяшчэнні, захоўванні і продажы фізічнымі асобамі алкагольных напояў». Пастанову аб гэтым Дэкрэце ўчора прыняла Палата прадстаўнікоў.**

### Захоўвай колькі хочаш...

**Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах, які прадстаўляў Пастанову ў Авальнай зале**, упэўнены, што з гэтым дакументам закон стаў больш ліберальным, узважаным.

— Калі алкагольная прадукцыя маркіравана акцызнымі маркамі, гэта ў дастатковай ступені пацвярджэнне легальнасці і законнасці яе знаходжання на нашай тэрыторыі, — растлумачыў міністр. — Гэта пацвярджэнне таго, што ўсе падаткі і неабходныя плацяжы выплачаны. Што да прадукцыі, якая трапляе да нас праз магазіны бяспошліннага гандлю, то яна немаркіраваная. Калі вы часта перасякаеце мяжу, то маеце магчымасць набываць, не парушаючы заканадаўства, пэўны аб'ём такіх тавараў. Калі вы не п'яце столькі, колькі набываеце, натуральна, гэта прадукцыя будзе назапашвацца ў вас дома. Тут, на нашу думку, — і Дэкрэт гэта пацвярджае — няма нічога супрацьзаконнага. Самае галоўнае, каб гэту прадукцыю — як маркіраваную, так і немаркіраваную — вы не выкарыстоўвалі ў прадпрымальніцкай дзейнасці.

**Васіль ДЗЕМІДОВІЧ, член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве**, расказаў журналістам, што гэты дакумент прыняты для супрацьдзеяння незаконнаму абароту алкагольнай прадукцыі і здымае пэўныя абмежаванні па перамяшчэнні і захоўванні алкаголю на тэрыторыі Беларусі.

— Дэкрэт падразумявае і адміністрацыйную адказнасць на выпадак парушэння заканадаўства ў гэтай сферы — уводзяцца штрафныя санкцыі ад 10 да 100 базавых велічынь. Таксама магчыма канфіскацыя траспартных сродкаў — у выключных выпадках па рашэнні суда, — праінфармаваў дэпутат.

### Дапамога айчыннаму экспарту

**Лілія КІР'ЯК, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы**, выступіла судакладчыкам праекта закона па ратыфікацыі міжурадавага беларуска-туркменскага Пагаднення аб вызваленні ад падатку на дадатковы кошт тавараў, што ўвозяцца Беларуска-туркменскім гандлёвым домам на тэрыторыю Туркменістана і Туркмена-беларускім гандлёвым домам на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь.

— Прыняцце гэтага законапраекта — адзін з канкрэтных крокаў, які дазволіць замацавацца нашай дзяржаве на сусветным рынку — перш за ўсё, на рынку тых дзяржаў, якія маюць значны патэнцыял узаемавыгаднага супрацоўніцтва, — сказала дэпутат журналістам. — Туркменістан — адзін са стратэгічных партнёраў Рэспублікі Беларусь, з якім будуюцца гандлёва-эканамічныя адносіны на сяброўскай аснове. Ратыфікацыя данага пагаднення дазволіць павысіць канкурэнтаздольнасць беларускіх тавараў на тэрыторыі Туркменістана і адпаведна павялічыць экспарт айчынных тавараў на тэрыторыі гэтай краіны.

### Акадэмічных абменаў стане больш?

Законапраект, які ратыфікуе Пагадненне паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Рэспублікі Польшча аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі, прадставіў **Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы.**

— Пагадненне, якое выносіцца на ратыфікацыю, надзвычай важнае для акадэмічных абменаў паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Польшча, — падкрэсліў ён. — На тэрыторыі Беларусі ўжо сёння дзейнічае дзве сярэднія школы, дзе цалкам усё навучанне вядзецца па-польску. Адна са школ знаходзіцца ў Гродне, другая — у Ваўкавыску. Як вядома, беларускае насельніцтва кампактна пражывае на тэрыторыі Падляскага ваяводства — там больш за 20% насельніцтва — беларускае. Згодна з Законам аб нацыянальных меншасцях Польшчы ад 2005 года яны маюць права карыстацца беларускай мовай і ў якасці дадатковай мовы навучання. Дамова вельмі істотна дапаўняе тыя палажэнні, якія былі раней. Самае важнае ў ёй — акадэмічныя абмены ў сферы вышэйшай адукацыі.

### Судовая сістэма па-новаму

**Наталля ГУЙВІК, старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве**, прадставіла ў другім чытанні праект закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях судаўладкавання і судавытворчасці».

— У сувязі з тым, што ў нас аб'яднаны Вярхоўны суд і Вышэйшы гаспадарчы суд, ліквідаваны Беларускі ваенны суд, міжгарнізонныя ваенныя суды, законапраект вызначае судовую сістэму Рэспублікі Беларусь, у якую ўваходзіць Канстытуцыйны суд і суды агульнай юрысдыкцыі. Тыя паўнамоцтвы, якія былі ў Міністэрства юстыцыі па арганізацыйным, матэрыяльна-тэхнічным, кадравым забеспячэнні, новай рэдакцыяй Кодэкса аб судаўладкаванні і статусу суддзяў перададзены Вярхоўнаму суду, — паведаміла парламентарый.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Пісьменніцкі форум

# ЛІТАРАТУРА ЯК ДАПАМОЖНІК У ВЫВУЧЭННІ СВЕТУ

## Краіне патрэбны разумныя людзі, носьбіты інтэлекту і новых ідэй...

**Пра гэта сведчыць увага да III з'езда Саюза пісьменнікаў Беларусі з боку афіцыйных асоб, якія прыйшлі, каб прывітаць удзельнікаў. Мандатная камісія палічыла: з 606 членаў арганізацыі на з'ездзе зарэгістраваліся 367. З трыбуны ішла гаворка пра вельмі надзённыя для літаратараў тэмы.**



— Здаецца, з таго часу, калі 150 пісьменнікаў стварылі нашу творчую суполку, мінула не так многа гадоў. Але крыху больш як за дзесяцігоддзе саюз значна вырас, і сёння яго членамі з'яўляюцца каля 600 аўтараў, якія працуюць у розных жанрах, — зазначыў у сваім дакладзе **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.** Па традыцыі паведамленне кіраўніка пісьменніцкай творчай арганізацыі распачало працу з'езда — пасля агучвання ўрачыстага прывітання ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, якое зачытаў Ігар Бузоўскі, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

— За апошнія пяць гадоў члены Саюза пісьменнікаў паказалі вельмі значныя станоўчыя вынікі. Калі ацэньваць аб'ектыўна, то іх можна выразіць у колькасці выдадзеных кніг, — падкрэсліў у дакладзе Мікалай Чаргінец. — Так, на працягу гэтага часу пісьменнікі прадставілі чытачам больш як 1750 выданняў. І выніковасць працы зусім не залежыць ад месца жыхарства творцы: аўтары, якія жывуць у рэгіёнах, у гэты час працавалі не менш актыўна, чым сталічныя. Разам з дзяржаўнай падтрымкай мы маем спонсарскую дапамогу, атрымалі і дазвол Прэзідэнта на тое, каб самім зарабляць грошы. Разумеем: не трэба спадзявацца на іншых, варта і самім працаваць лепш, навучыцца «манетызаваць» сваю дзейнасць. Магчыма, падумаць пра арганізацыю платных выступленняў, абмяркоўваць ганарары за выкананне твораў нашых аўтараў падчас канцэртаў.

Таксама Мікалай Чаргінец звярнуў увагу на тыя цяжкасці, з якімі пісьменнікі сутыкаюцца ў сваёй працы. Гэта, вядома, адсутнасць агульнага прызнання грамадствам значнасці кнігі і работы пісьменніка. Сёння творчасць у літаратуры ўспрымаецца хутчэй як хобі, а не прафесія, таму стаяць пытанні пра забеспячэнне пісьменнікаў пенсіямі, вышэйшымі за мінімальныя, пра выдзяленне творцам арэнднага жылля. Па меркаванні старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, патрэбна больш увагі надаваць маладым аўтарам, праводзіць для іх семінары, садзейнічаць выданню кніг.

У ліку «балючых» — і пытанне прысутнасці пісьменнікаў у публічнай прасторы і СМІ. Так, Мікалай Чаргінец заклікаў аўтараў актыўней сустракацца з чытачамі, ладзіць аўтограф-сесіі ў кнігарнях. Старшыня саюза звярнуўся да кіраўнікоў рэспубліканскіх газет і тэлеканалаў з просьбай актыўней асвятляць літаратурнае жыццё краіны, расказваць пра новыя кнігі для дарослых і дзяцей.

У сваёй прамове **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ** засярodзілася на асвятленні работы кнігавыдавецкай галіны:

— Штогод у краіне выходзіць звыш 10 тысяч найменняў кніг тыражом амаль 22 мільёны экзэмпляраў. Нягледзячы на тое, што гэта вялікія лічбы, трэба прызнаць, што дзесяць гадоў таму мы мелі тыражы кніг, якія выдаваліся ў краіне, у два разы большыя. У апошнія гады намецілася ўстойлівая тэндэнцыя па павелічэнні выпуску кніг на беларускай мове: гэта ў сярэднім 1000—1200 назваў у год тыражом 4 мільёны экзэмпляраў. Літаратура на беларускай мове займае больш за 11 працэнтаў у агульнай колькасці выпушчанай беларускімі выдавецтвамі літаратуры і набліжаецца па сваіх тыражных характарыстыках да 17—20 працэнтаў у сукупным тыражы.

Міністэрства інфармацыі фактычна адказвае за рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў галіне кнігавыдання. Адным з важнейшых і прыярытэтных кірункаў дзейнасці беларускіх выдавецтваў з'яўляецца выпуск мастацкай, у тым ліку дзіцячай, літаратуры беларускіх аўтараў. Лілія Ананіч падкрэсліла, што колькасць выпушчаных за апошнія 5 гадоў кніг літаратурна-мастацкага кірунку сёння вызначаецца ў межах 1500—2000 найменняў на год. Кожная дзясятая кніга — літаратурна-мастацкая. Кніг беларускіх пісьменнікаў выпускаецца ў нашай краіне прыкладна да 800 назваў штогод. Міністэрства працуе ў цесным узаемадзеянні з Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Выконваючы даручэнне кіраўніка дзяржавы, з 2012 года штогод 10—12 кніг сучасных беларускіх пісьменнікаў выдаюцца пры поўнай дзяржаўнай падтрымцы і пастаўляюцца для камплектавання фондаў у публічныя бібліятэкі нашай краіны — такім чынам знаходзяць свой шлях да чытача.

«Кніжная тэма» дамінавала і ў выступленні **міністра культуры Беларусі Барыса СВЯТЛОВА**: установы Міністэрства культуры з'яўляюцца найбольш актыўнымі спажыўцамі працы літаратараў — бібліятэкі, літаратурныя музеі, установы адукацыі ў сферы культуры і іншыя. Толькі ў мінулым годзе публічныя бібліятэкі папоўніліся сацыяльна значнай літаратурай на суму больш як 800 тысяч дэнамінаваных рублёў. Але ж супрацоўніцтва з пісьменнікамі накіравана і на тое, каб прадставіць асоб: праз фестывалі, прэзентацыі, творчыя сустрэчы... Барыс Святлоў адзначыў:

— Сённяшні з'езд стаіць у шэрагу найбольш важных сустрэч творчых работнікаў нашай краіны. Упэўнены, што ён стане штуршком для далейшага развіцця беларускай літаратуры і культуры ў цэлым. Стане для пісьменнікаў стымулам у новых здзяйсненнях, а для нас — крыніцай інфармацыі аб найбольш штодзённых патрэбах творчай супольнасці.

Супольнасць уплывовая. І на грамадства ў цэлым, і на асобныя яго пакаленні, якія ў наш час вельмі па-рознаму прыходзяць да беларускай літаратуры. Але класічны пачатак — са школы.

— У вучэбных праграмах па рускай і беларускай мове і літаратуры ёсць раздзелы, якія прапануюць вучням азнаёміцца з творчасцю сучасных пісьменнікаў Беларусі. У прыватнасці, супрацоўніцтва з пісьменнікамі ідзе па падрыхтоўцы падручнікаў і кніг серыі «школьная бібліятэка», — адзначыў **першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Вадзім БОГУШ**. Таму што «беларускія пісьменнікі ствараюць мастацкі летапіс гісторыі сваёй Радзімы».

Як, напрыклад, Іван Мележ у «Людзях на балоце», узгадаў **Аляксандр РАДЗЬКОЎ, старшыня грамадскага аб'яднання «Белая Русь»**. Ён параўнаў працу пісьменнікаў у адносінах да грамадства з задачамі квантавай фізікі: гэта вывучэнне свету, стварэнне мадэляў, праз якія можна атрымаць адказы на запыты людзей.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*
**Ларыса ЦІМОШЫК.** *tsimoshyk@zviazda.by*

**P.S.** ***Дарэчы, падчас III з'езда Саюза пісьменнікаў Беларусі, як і падчас кожнай з гэтых традыцыйных сустрэч, прайшла цырымонія выбараў старшыні творчай арганізацыі. Ім перавыбраны Мікалай ЧАРГІНЕЦ***

■ Пазіцыя

# ПАМІЖ ТВОРЦАМ І ДЗЯРЖАВАЙ

## Які знак варта ставіць, высвятлялі эксперты

**У Мінску адбылося трэцяе пасяджэнне клуба «Адкрыты дыялог». У ім узялі ўдзел каля трыццаці знаўцаў з розных сфер: мастацтва, сродкаў масавай інфармацыі, бізнесу, вышэйшай адукацыі, грамадскіх аб'яднанняў, дзяржаўнай службы. Гэтым разам асноўнай тэмай дыскусіі стала месца творцы ў дзяржаўным будаўніцтве. Так, па словах Андрэя БЕЛЯКОВА, першага сакратара Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, сустрэча клуба заклікана нагадаць пра ўклад творчай інтэлігенцыі, у прыватнасці літаратараў, у развіццё беларускага грамадства.**

**Галоўным спікерам стаў расійскі паэт, публіцыст, крытык, мастацтвазнаўца Юрый КУБЛАНОЎСКІ**. Ужо пасля мерапрыемства ён прызнаўся журналістам, што ў захапленні ад таго, што раніцай буднага дня шырокае кола дзяржаўных служачых, грамадскіх дзеячаў і творцаў сабраліся, каб абмеркаваць надзённыя для інтэлігенцыі пытанні. Гутарка ж на самой сустрэчы, пачаўшыся з цытаты Уладзіміра Маякоўскага, перайшла на яго асобу. «Гэта паэт, у якога быў бясспрэчны Божы дар, а ён паклаў яго на алтар агітацыі і прапаганды, — лічыць пісьменнік. — Паэзія — гэта заданне, якое трэба выканаць як мага лепей. І яно не залежыць ні ад дзяржавы, ні ад публікі».

**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі**, у адказ выказаў меркаванне, што любы чалавек, які мае ўласную пазіцыю, «ужо агітуе, ужо пэўным чынам уплывае». «Аднаму чалавеку, напэўна, значна складаней, і, хутчэй, практычна немагчыма вырашыць глабальныя працэсы ў грамадстве. Таму людзі імкнуцца кансалідавацца ў грамадскія аб'яднанні, саюзы, арганізацыі і рухаць наперад разам з аднадумцамі пэўныя ідэі», — лічыць намеснік кіраўніка Адміністрацыі.

Асобна Ігар Бузоўскі звярнуў увагу на стаўленне да слова «заказ». На яго думку, калі тэма цікавая і важная для грамадства, трапляе на хвалю творцы, падыходзіць яму па сферы дзейнасці, у гэтым няма нічога дрэннага. Кансалідацыя дзяржавай такога кшталту людзей адбываецца з адной мэтай — аб'яднаць, згуртаваць грамадства. Такім чынам прасоўваюцца ідэалы, сэнсы, каштоўнасці, якія ставяцца прыярытэтам. І калі «кіраўніцтва дзяржавы знаходзіцца на адной хвалі з творчай інтэлігенцыяй», то перш за ўсё гэта станоўча адбіваецца на грамадстве і называць «заказам» такі стан рэчаў, лічыць ён, не варта.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Меркаванне

# СУСТРЭЧЫ ТРЭБА ЦАНІЦЬ

**Кожны дэлегат III з'езда Саюза пісьменнікаў Беларусі адправіўся на гэты сход са сваімі радасцямі, спадзяваннямі, памкненнямі і чаканнямі. Мы запыталіся ў розных творцаў, якое значэнне адыгрывае з'езд у жыцці пісьменніцкай супольнасці ў цэлым і на іх асабістым творчым шляху ў прыватнасці.**



**Генадзь ПАШКОЎ, першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт:**

— З'езд, як правіла, акрэслівае пэўны этап жыцця саюза. Пяць гадоў прайшло з часу нашай папярэдняй вялікай сустрэчы. І калі з самага пачатку работы пісьменніцкай арганізацыі мы больш увагі надавалі арганізацыйным пытанням, стварылі абласныя і Мінскае гарадское аддзяленні, утварылі секцыі па жанрах літаратуры, то цягам апошніх пяці гадоў маглі больш увагі надаваць справе творчай. Так, конкурс на найлепшы твор, арганізаваны раней, з мінулага года ператварыўся ў Нацыянальную літаратурную прэмію. Пісьменнікі ў наш час прымаюць удзел не толькі ў літаратурных мерапрыемствах, але і грамадска-культурных, стараемся працаваць сумесна з мясцовымі органамі ўлады, замежнымі пісьменніцкімі арганізацыямі.



**Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, доктар філалагічных навук, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:**

— На з'ездзе цікава найперш пабачыцца з калегамі, прывітацца. Сустрэчы трэба цаніць, нават проста ў чалавечым плане. Бо творчасць за сталом — справа адзінокая, пісьменнік заўсёды спрачаецца сам-насам з чыстым аркушам паперы. Творцу варта часцей выходзіць на вуліцу, у людзі — каб ісці ў нагу з жыццём ці нават у некаторых момантах яго апераджаць. Раней часта казалі пра тое, што кніга перарабляе свет, але цяпер так не скажам. Мы амаль адмовіліся ад ідэалогіі асветніцтва, калі навуцы, мастацтву надавалася вялікая роля ў пераробцы жыцця, чалавека. Сёння на першы план выходзіць эканоміка, гаспадарка. Таму варта думаць і пра змены ва ўтварэнні коштаў на кнігі, каб новыя выданні былі больш даступнымі для чытачоў.



**Алена СТЭЛЬМАХ, намеснік старшыні Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі:**

— Па атмасферы, што пануе сёння ў зале і кулуарах, відавочна, што з'езда чакалі, да яго рыхтаваліся. Пяць гадоў, што прайшлі пасля мінулага з'езда, былі вельмі творчымі, насычанымі для пісьменніцкай грамадскасці. Толькі ў нашым абласным аддзяленні за гэты час выйшла амаль 450 кніг. Гэта розныя выданні — ад фаліянтаў да дзіцячых казак. Вельмі прыемна, што пашырыліся нашы шэрагі. З'езд дае нам магчымасць выказаць грамадзянскую пазіцыю, падкрэсліць значнасць слова, якое павінна гучаць у грамадстве. Галоўная наша думка — каб слова, што ідзе ад пісьменніка, служыла на карысць дабру, дабрабыту, спрыяла добрым стасункам паміж людзьмі.



**Сяргей КЛІМКОВІЧ, дзіцячы пісьменнік, лаўрэат II Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Дэбют»:**

— Любы форум прадугледжвае дыялог, зносіны, абмен думкамі, цікавыя сустрэчы, знаёмствы. Вядома, і абмен кнігамі. Думаю, для пісьменніка заўсёды важна трымаць руку на пульсе і быць у кантакце з калегамі. На з'езд я прывёз адну са сваіх кніг, першую ў серыі «Тайна кватэры №8». Яна ўжо цэлы год прадаецца ў Беларусі і Расіі, і я атрымліваю толькі станоўчыя водгукі ад калег і чытачоў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Супрацоўніцтва

# КРАІНА ДЛЯ КОЖНАГА

## Праект ААН «Інклюзіўная Беларусь» стартаваў у Гродне

**Больш за 30 гарадскіх мерапрыемстваў на пачатку тыдня наведаў Санака САМАРАСІНХА, пастаянны каардынатар ААН у Беларусі. Ён нагадаў, што наша краіна па каэфіцыенце Джыні — індэксе, які выкарыстоўваецца для вымярэння роўнасці ў размеркаванні даходаў сярод насельніцтва — апярэджвае нават Швецыю. Праблемы, з якімі сутыкаюцца найбольш уразлівыя слаі насельніцтва, паступова вырашаюцца, і мы ўжо маем добрыя вынікі на шляху рэалізацыі Мэты 10 у галіне ўстойлівага развіцця — памяншэнне няроўнасці.**

Работа па 17 напрамках, якія абазначыла ААН, летась пачалася адначасова па ўсім свеце. **Кацярына ПАНІКЛАВА, намеснік пастаяннага прадстаўніка Праграмы развіцця ААН**, расказала, якія ў Беларусі поспехі ў гэтых кірунках:

— Мэты ўстойлівага развіцця ўнікальныя. Упершыню за ўсю гісторыю чалавецтва яны ўключаюць у сябе адзін вельмі важны падыход — гэта няроўнасць. Мэты тысячагоддзя былі ў асноўным для краін, якія развіваюцца. А гэтыя — для ўсіх дзяржаў. Няроўнасць праходзіць чырвонай ніткай праз усе мэты, і мы лічым, што Рэспубліка Беларусь можа паказаць вельмі добрыя напрацоўкі. Сусветную няроўнасць можна пераадолець. У гэтым галоўная мэта нашай «Інклюзіўнай Беларусі», якую мы хочам правесці па ўсёй краіне і паказаць практыкі, калі інваліды з'яўляюцца часткай грамадства, дзеці з самага ранняга ўзросту ўдзельнічаюць у будаўніцтве дзяржавы, калі прадпрымальнікі шукаюць і выкарыстоўваюць зялёныя тэхналогіі, каб прадухіліць змяненне клімату. Мы кожную мэту разглядаем у сукупнасці з іншымі. Добрае здароўе не можа быць без дастойнай працы, вартая праца немагчымая без пераадолення няроўнасці. І ўсё гэта недасягальна, калі ўрад не будзе мець прафесійных дзяржаўных служачых і ўстойлівыя інстытуты. Беларусь ужо робіць крокі ў гэтым кірунку і апераджае многія краіны.

За апошнія 16 гадоў нам у значнай ступені ўдалося знізіць узровень беднасці: да 5%. Спадар Самарасінха адзначае, што Беларусь уваходзіць у топ-30 краін па гендарнай роўнасці. У рамках мерапрыемстваў у Гродне асаблівая ўвага надавалася тым выклікам, з якімі сутыкаюцца людзі з рознымі відамі інваліднасці. У нас пражывае каля паўмільёна людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Не так даўно Беларусь ратыфікавала Канвенцыю аб правах інвалідаў, і цяпер трэба ісці за гэтымі высокімі стандартамі.

— Я сапраўды быў уражаны ўсімі дасягненнямі абласнога, гарадскога і раённых органаў кіравання, — расказаў Санака Самарасінха. — Разам з губернатарам мы падпісалі дэкларацыю, у рамках якой абавязаліся гарантаваць, што ўсе тыя групы, якія могуць аказацца ўбаку ад дасягнення гэтых мэт, таксама будуць актыўна ўключацца. Тым самым мы забяспечым выкананне Мэты 10. У межах дадзенага мерапрыемства вызначалі, хто можа належыць да такіх уразлівых груп і з якімі цяжкасцямі і бар'ерамі ім прыйдзецца сутыкацца. Гэта робіцца для таго, каб яны маглі не толькі самастойна клапаціцца аб сабе, але і быць карыснымі для сваёй краіны. Яшчэ адна мэта нашых мерапрыемстваў — стварыць пляцоўку, дзе можна размаўляць адзін з адным, тым самым развіваючы талерантнасць, і каб людзі, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі гэтых груп, маглі паверыць у свой патэнцыял і былі гатовыя яго праявіць.

Яшчэ адзін напрамак у кампаніі «Інклюзіўная Беларусь» — пераадоленне тых цяжкасцей, з якімі сутыкаюцца жанчыны, моладзь і дзеці. У межах гарадскіх мерапрыемстваў у Гродне была праведзена школа жаночага лідарства, накіраваная на развіццё задаткаў кіраўніка сярод жанчын, у прыватнасці ў дзяржаўным сектары. Без увагі не засталіся і пытанні хатняга гвалту і гандлю людзьмі, якія абмяркоўваліся падчас правядзення кампаніі. Беларусь узяла на сябе асаблівыя абавязкі, у тым ліку і па гэтым пытанні, прыняўшы сёлета Нацыянальны план па правах чалавека. **Намеснік міністра замежных спраў Беларусі Алена КУПЧЫНА** адзначыла, што «прыняцце такога плана адбылося ўпершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі. Больш за 20 дзяржаўных устаноў, больш за 40 няўрадавых арганізацый, разнастайныя агенцтвы ААН у Беларусі прымалі ўдзел у яго распрацоўцы, было шмат заўваг і прапаноў, значная колькасць іх была ўнесена ў гэты план».

У Гродне ў межах правядзення кампаніі таксама аналізаваліся тыя цяжкасці, з якімі сутыкаюцца пажылыя людзі. Санака Самарасінха адзначыў, што ў гэтым пытанні важна думаць не толькі пра тое, якім чынам больш мэтанакіравана прадастаўляць неабходныя ім паслугі, але таксама і як лепш выкарыстоўваць назапашаны імі вопыт і веды. Такім чынам, мы маглі б у максімальнай ступені выкарыстоўваць той патэнцыял, які ў іх ёсць. Але з праблемамі сутыкаецца і найбольш актыўная частка нашага насельніцтва — моладзь.

— Мы закранулі пытанні і пра наркотыкі і наведалі адну з клінік, — адзначае пастаянны каардынатар ААН у Беларусі. — Таксама ў Гродне была запушчана кампанія па тэставанні на ВІЧ. Яшчэ мы звярнулі ўвагу на стварэнне новых рабочых месцаў і аказанне дапамогі маларазвітым і бедным сельскагаспадарчым раёнам. У прыватнасці, гэта тычылася пытання падтрымкі малых прадпрыемстваў шляхам прадастаўлення ім стартавага капіталу. Па ўсіх гэтых кірунках у нас ужо або існуюць праекты, або яны будуць запушчаны на пачатку наступнага года. Дзякуючы абмеркаванню тых патрэб, з якімі сутыкаюцца жыхары канкрэтнай вобласці, мы маем магчымасць іх змяняць, каб яны максімальна адказвалі запытам насельніцтва. І ўсё гэта рэалізуецца ў межах той рамачнай праграмы, якая была падпісана паміж ААН і Беларуссю ў мінулым годзе. Яе бюджэт разлічаны на пяць гадоў і складае 111 мільёнаў долараў.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# Школа лідарства для жанчын і майстар-клас для інвалідаў

**У Брэсце распачаліся мерапрыемствы рэгіянальнай кампаніі «Інклюзіўная Беларусь: не пакідаючы нікога ў баку ад дасягнення Мэт устойлівага развіцця». Гэта сумесны праект ААН і Міністэрства замежных спраў Беларусі. Ён стартаваў у Гродне некалькі дзён таму і зараз прадоўжаны ў горадзе над Бугам.**

Галоўнай пляцоўкай большасці мерапрыемстваў стаў брэсцкі Цэнтр маладзёжнай творчасці. Тут разгорнуты выставы агенцтваў сістэмы ААН, пасольстваў розных краін, а таксама мясцовых грамадскіх арганізацый. Экспазіцыі выстаў пабудаваны так, што любы наведвальнік зацікавіцца пытаннямі роўных правоў і магчымасцей. Мовай шматлікіх экспанатаў аўтары сцвярджаюць: у працэсы развіцця грамадства павінны быць уключаны ўсе людзі, незалежна ад полу, узросту, стану здароўя, этнічнай прыналежнасці, рэлігіі, паходжання.

Напрыклад, госці змогуць пазнаёміцца з выставай малюнкаў ахвяр гандлю людзьмі. А фотавыстава-прэзентацыя «Мост у будучыню» ўяўляе сабой шэраг гісторый, героі якіх расказваюць пра наркаманію — хваробу, якая можа зачапіць кожнага.

Праграма мерапрыемстваў уключае ў сябе круглыя сталы па праблеме адаптацыі інвалідаў, «Школу лідарства для жанчын», шматлікія майстар-класы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Дакументальныя кінастужкі па гэтай тэме вытворчасці Вялікабрытаніі, Швецыі дапоўняць выставы пасольстваў розных краін.

Пасля Брэста кампанія «Інклюзіўная Беларусь» прадоўжыць шлях па абласных цэнтрах, 9—10 снежня мерапрыемствы форуму пройдуць у Мінску.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Запрашальнік

# ДЗЕЛЯ МІЖКАНФЕСІЙНАГА МІРУ

**1 і 2 снежня ў Мінску пройдуць Другія беларускія калядныя чытанні. Сёлета яны маюць адметную тэму — «1917—2017. Праваслаўе ў гісторыі і культуры Беларусі: вынікі стагоддзя». У цэнтры ўвагі чытанняў будуць актуальныя праблемы духоўна-маральнага жыцця беларускага грамадства, культурная спадчына, а таксама гістарычная рэтраспектыва мінулага стагоддзя.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Злева направа: Сергій ЛЕПІН, Аляксандр КАВАЛЕНЯ, епіскап ВЕНІЯМІН, Марыя НЕЦВЯТАЕВА.

Як паведаміў **епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі ВЕНІЯМІН**, да ўдзелу ў чытаннях запрошаны святары, прадстаўнікі ўлады, дзеячы культуры, навуковыя супрацоўнікі, прадстаўнікі сілавых структур, устаноў адукацыі і многія іншыя. Сваю работу распачне тэматычная фотавыстаўка. Адначасова будзе прадстаўлена экспазіцыя з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — наведвальнікі змогуць убачыць рэдкія рукапісныя і старадрукаваныя кнігі. Некаторыя з іх увазе публікі будуць прапанаваныя ўпершыню.

— Мы чакаем не толькі асоб высокага рангу, але і школьнікаў з іх дакладамі, прадстаўнікоў раённай інтэлігенцыі, — заўважыў **протаіерэй Сергій ЛЕПІН** на сустрэчы з журналістамі. — Мы прынцыпова адкрытыя для розных наведвальнікаў. Будзем рады, калі чытанні зацікавяць не толькі праваслаўных, але і прадстаўнікоў іншых канфесій. Будзе прыемна, калі далучацца таксама прадстаўнікі розных прафесій і спецыяльнасцяў.

Падчас чытанняў адбудзецца ганаровае ўзнагароджванне найлепшых педагогаў граматай Сінадальнага аддзела рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Беларускай праваслаўнай царквы. Будуць падведзены вынікі конкурсу дзіцячага малюнка. У перспектыве плануецца заснаванне прэміі «За маральны подзвіг настаўніка».

**Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ** адзначыў:

— Нацыянальная акадэмія навук вядзе сёння вялікую работу па даследаванні гісторыі царквы. Штогод мы рыхтуем каля 100 манаграфій, датычных гэтай тэмы. У некага можа ўзнікнуць пытанне, ці не супрацьпастаўляем мы рэлігію і навуку?.. Я думаю, што абодва гэтыя паняцці ў нашай краіне ўспрымаюцца як дзве чашы вагаў. Яны павінны ўзаемадзейнічаць. У 2003 годзе мы заключылі дагавор аб супрацоўніцтве з беларускай праваслаўнай царквой. Гэта вялікія даследаванні, накіраваныя на патрыятычнае выхаванне маладога пакалення. За гэты час правялі каля дзясятка навуковых канферэнцый — у Жыровічах, Капылі, Слуцку, Смаргоні і многіх іншых рэгіёнах краіны. Я думаю, такая традыцыя будзе спрыяць умацаванню міжнацыяльнага і міжканфесійнага супрацоўніцтва.

Урачыстае адкрыццё і пленарнае пасяджэнне Другіх беларускіх чытанняў, прымеркаваных да Раства, адбудзецца 1 снежня аб 11-й гадзіне ў канферэнц-зале Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# ЯК РАМОНТ УПЛЫВАЕ НА... ДЭМАГРАФІЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як вынік, з 1 верасня тут на свет з'явілася 400 немаўлят, у тым ліку 10 двайнят. А з пачатку 2016-га ў Салігорскай радзільні прынялі 1700 родаў.

У планах — другая чарга радзільнага дома, што дазволіць значна палепшыць умовы, узровень медыцынскай дапамогі для маці і малых.

Рамонт нават у кватэры — гэта складана і дорага. А тым больш у бальніцы, школе, доме культуры... Як правіла, заўсёды ўзнікае пытанне: як зменшыць яго кошт? У Мінскай вобласці знайшлі выхад. Установы адукацыі, аховы здароўя, культуры падтрымалі прапанову кіраўніцтва Мінаблвыканкама рамантаваць памяшканні гаспадарчым спосабам. З абласнога бюджэту на гэтыя мэты апошнія тры гады выдзяляюцца сродкі.

— Рамонт гаспадарчым спосабам абыходзіцца ў паўтара-два разы танней, чым па дагаворах падраду, — сцвярджае Вольга Белавус. — Такім чынам мы ўладкавалі пульманалагічнае аддзяленне (пост №1) на 50 месцаў, два фельчарска-акушэрскія пункты, амбулаторыю, будынак судмедэкспертызы. На закупку абсталявання, мэблі накіроўваюцца і сродкі, што зарабілі за аказанне платных медыцынскіх паслуг.

Сёлета ўстанове на «гаспадарчы» рамонт выдзелена 300 тыс. рублёў. Цяпер даводзіцца да ладу будынак, дзе размесціцца псіханеўралагічны дыспансер. Ён разлічаны на 1 тысячу наведванняў у дзень. Гэта дазволіць разгрузіць раённую паліклініку, якая павінна прымаць 600 чалавек за змену, а фактычна сюды звяртаецца ўдвая больш пацыентаў. На чарзе — рамонт пульманалагічнага аддзялення (пост №2), што дазволіць давесці колькасць месцаў для пацыентаў да 80.

— Мы маем у штаце супрацоўнікаў з будаўнічай адукацыяй, а таксама наймаем работнікаў па грамадзянска-прававых дагаворах, — кажа Вольга Белавус. — Самі закупляем айчынныя матэрыялы, якасныя, але больш танныя, чым замежныя. Нашы маляры, тынкоўшчыкі, цесляры працуюць выключна за зарплату. Гэта дае магчымасць эканоміць бюджэтныя сродкі.

— Настаўнікі цяпер з задавальненнем ходзяць на работу, а вучні ахвотна садзяцца за парты, — уступае ў размову **дырэктар сярэдняй школы №2 г. Салігорска Марына КРАЎЧЭНЯ.** — Гэтая навучальная ўстанова адна з самых старэйшых у горадзе. Першы корпус быў здадзены ў эксплуатацыю ў 1963 годзе, другі — 30 гадоў таму. З таго часу ў нас не было капітальнага рамонту. І толькі дзякуючы ініцыятыве кіраўніцтва Мінаблвыканкама мы змаглі абнавіць стары будынак. На працягу 2015—2016 гадоў гаспадарчым спосабам адрамантавалі фае першага паверха, цалкам другі паверх, калідор, гардэробы для вучняў пачатковых класаў, 16 санвузлоў, сталовую, буфет, залу прыёму ежы, гарачы, мясны, кандытарскі, мыйны цэхі. На ўсё затрацілі 360 800 рублёў. Прафесійны дызайнер дапамог аздобіць памяшканні, падабраць колеры для фае, вучэбных класаў.

**Рамонт нават у кватэры — гэта складана і дорага. А тым больш у бальніцы, школе, доме культуры... Як правіла, заўсёды ўзнікае пытанне: як зменшыць яго кошт? У Мінскай вобласці знайшлі выхад.**



— У раёне налічваецца 79 навучальных устаноў, — расказаў **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Салігорскага райвыканкама Ігар ЦЫБУЛЬКА.** — І кожная з іх змагла ў той ці іншай меры прыняць удзел у праграме рамонту гаспадарчым спосабам. Гэтая сістэма добрая тым, што адначасова можна адрамантаваць некалькі ўстаноў. Самі кіраўнікі вызначаюць, якія аб'екты ў першую чаргу трэба ўладкаваць, якія работы змогуць асіліць. Усяго ў праграме за 3 гады прынялі ўдзел 62 установы адукацыі, у тым ліку 28 сельскіх. Упершыню ў Салігорскім раёне за адносна кароткі тэрмін удалося выканаць значныя аб'ёмы работ менавіта дзякуючы грамадзянска-прававым дагаворам. У наступным годзе плануем прадоўжыць абнаўленне ўстаноў адукацыі.



Такім арыгінальным спосабам Дзмітрый СЛЯПЦОЎ віншуе жонку Марыну з нараджэннем дачкі.

— У школе №2 вучацца мае сын і дачка. Ім падабаецца ў школе ўсё: яркае, сонечнае фае, класы колеру марской хвалі, якія настройваюць на спакойны лад. Сапраўды, на маю думку, усё прадумана так, каб дзеці камфортна і ўтульна сябе адчувалі, спасцігалі веды, — выказала сваю думку маладая маці Ірына.

— А ці плануеце ў такім разе папоўніць сям'ю? — пацікавілася я.

— А чаму б і не? — засмяялася жанчына.

Да ведама, натуральны прырост насельніцтва за мінулы год адзначаны ў пяці раёнах вобласці: Дзяржынскім, Мінскім, Смалявіцкім, Маладзечанскім і Салігорскім, а таксама ў горадзе Жодзіна.

Дадам, што з 2014 па 2016 год на рамонт гаспадарчым спосабам ва ўстановах адукацыі з абласнога бюджэту накіравана 5 687 000 рублёў, ва ўстановах аховы здароўя — 30 300 000 рублёў. Сёлета работы прадоўжацца. А значыць, павысіцца ўзровень медыцынскай дапамогі, якасць навучання. Магчыма, гэтыя абставіны станоўча паўплываюць на дэмаграфію.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# ЗАБЫЦЬ, КАБ ВЫРАТАВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Жыццё выхоўвае, калі нам ніхто не перашкаджае. За дрэнныя ўчынкі заўсёды прыходзіць адплата. Калі чалавек не прайшоў нейкія складанасці, не панёс адказнасці за свае паводзіны, ён можа і не прыйсці, каб пачаць ачуньваць, — заўважае **старшыня РГА «Маці супраць наркотыкаў» Ірына ЛУК'ЯНОВІЧ.** — Камусьці трэба некалькі разоў пасядзець у турме. У іншых узнікаюць праблемы са здароўем, яны трапляюць у псіхдыспансеры. Трэцяму дастаткова, каб бацькі выставілі за дзверы, ён паходзіць, пабамжуе і зразумее, што трэба нешта з гэтым рабіць. Вельмі многае залежыць ад сям'і, у 95% выпадкаў, калі бацькі змянілі свае паводзіны, іх дзеці пачынаюць папраўляцца. Але не ўсе блізкія гэта разумеюць. У нас ёсць хлопец, які прайшоў дзесяць рэабілітацыйных цэнтраў, ён вяртаецца ў асяроддзе, быццам і нармальнае, дзе бацькі не выпіваюць і не кураць, але яны сузалежныя. Максімум год цвярозасці — і хлопец зрываецца.

**«Шмат такіх прыкладаў: вельмі адказная, правільная дзяўчынка, выдатніца, і другая частка яе жыцця: наркаманка, прастытутка».**

***— Атрымліваецца, бацькі — першыя ратавальнікі для наркамана...***

— На этапе пакуль ён на ўтрыманні, наркаман не адчувае, што для яго гэта праблема. Бацькі павінны стварыць такую атмасферу ў доме, каб ён яе ўсвядоміў, зразумеў, што нешта трэба з гэтым рабіць. Спачатку — гэта толькі жорсткія меры. Не гвалт (што толькі горш), а ўмовы. Напрыклад, чагосьці пазбаўляешся, калі не прытрымліваешся ўстаноўленых правілаў. Можа нават такія: «альбо едзеш на рэабілітацыю, альбо — бомж». У дачыненні дарослых дзяцей — не карміць, не апранаць... Калі ж залежны пачынае рабіць нейкія крокі да папраўкі, бацькі павінны памяняць стратэгію адносін да свайго хворага. Мы вучым, як сябе паводзіць на розных стадыях.

***— Праблема сузалежнасці гэта ж не толькі «падсілкоўванне»?***

— Галоўная праблема ў тым, што такія людзі жывуць не сваім жыццём, а жыццём залежнага чалавека. Усе думкі толькі пра хворае дзіця: як яго абараніць, што зрабіць, як паўплываць, каб не ўжываў. Сузалежны не думае аб тым, як вырашаць штодзённы клопат, забываецца пра іншых блізкіх, урэшце рэшт пра тое, што яму самому трэба з'ездзіць адпачыць. Мы кансультавалі па скайпе дзяўчыну з іншай краіны, якая хоча дапамагчы брату-наркаману. Далі заданне «забыць»: не тэлефанаваць, не пытацца. Дзяўчына была ўражана: у яе з'явіўся час на мужа, на дзіця.

## САМО НЕ ПРОЙДЗЕ

***— Чаму бацькам не трэба адкладаць рашэнне гэтай праблемы?***

— Наркаманія маладзее. Да нас прыходзяць 15-гадовыя, якія год ці два спажывалі. Часцей такія дзеці пачынаюць з кішэнных грошай, а пасля іх уцягваюць у распаўсюджванне, і яны такім чынам зарабляюць на наркотыкі. Непаўналетнія больш паддаюцца ўплыву, чым паўналетнія.

| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 16.12.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. Более подробную информацию можно получить на сайте Главного управления юстиции Витебского облисполкома www.vitebskjust.gov.by |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1.** Здание склада (капитальное строение, инв. №230/С-15130), начальная стоимость лота 1836 белорусских рублей. **Лот №2.** Здание проходной (капитальное строение, инв. №230/С-15136), начальная стоимость лота 7281 белорусский рубль |
| **Собственник (владелец) имущества** | Открытое акционерное общество «Лепельпромшвеймебель» |
| **Местонахождение имущества** | Витебская область, г. Лепель, ул. Володарского, 1, 1/4. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ОАО «Лепельпромшвеймебель» Жукову Владимиру Анатольевичу, тел. 8 (033) 337-15-38 |
| **Наличие обременений** | Не имеется |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 26 декабря 2016 года в 11.00 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 15.00 23 декабря 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

Страховые полисы по добровольному страхованию «Универсальный» серии ПЕ № 0090656, ПЕ № 0138017, ПЕ № 0143370, ОСГО ВТС РБ серии ВА № 1942771, ВА № 1996846, ВС № 7139913, ВР № 5391337, ВР № 5391340-342, ВР № 5391344, ВС № 7139913, ВС № 7139915, ВС № 7161153-154, Зеленая карта серии BY07 № 10899821, № 07422368-369, № 10886037-041, добровол. страхов. от НС на время поездки за границу серии БА № 0201740, № 0205015, № 0285081-082, № 0073412, № 0132789, № 0542056, № 0639933, 0425802, № 0425820, № 0470987, № 0508961, № 0631384, № 0631385, № 0631459, № 0178043, № 0223887, № 0285764, № 0285765, № 0285767, № 1026720, квитанция 1СУ серии КС № 3605094, КС № 3590664 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

# Краіна здароўя

Выпуск №21 (374)

■ Фармацыя

## Новыя лекі для дыябетыкаў

**У наступным годзе Белмедпрэпараты атрымаюць замежнае абсталяванне, якое дазволіць пачаць у 2018 годзе выпуск інсуліну новай, картрыджнай, формы**

**Аб'ёмы выпуску будуць такімі, каб пакрываць не толькі патрэбы краіны, але і пастаўляць на экспарт у Расію. Больш за 80 працэнтаў інсулінаў у флаконах, неабходных хворым на цукровы дыябет, — айчыннай вытворчасці. Найбуйнейшае фармацэўтычнае прадпрыемства ў краіне забяспечвае дастатковую колькасць лекавых прэпаратаў для лячэння цукровага дыябету 1-га і 2-га тыпу, у тым ліку інсулінаў. Аднак сусветная фармацэўтыка развіваецца, і айчынная ахова здароўя імкнецца забяспечваць самыя сучасныя спосабы лячэння.**

— Раней мы вывелі на рынак новы прэпарат кубінскай вытворчасці «Эберпрот», затрацілі значныя рэсурсы на правядзенне клінічных выпрабаванняў на базе 10-й клінікі Мінска, — кажа **генеральны дырэктар РУП «Белмедпрэпараты» Павел КАХАВЕЦ.** — Прэпарат гэты неабходны для лячэння пацыентаў з сіндромам дыябетычнай ступні. Кошт лячэння такіх пацыентаў досыць высокі — адзін курс абыходзіцца дзяржаве ў 3—4 тысячы долараў.

— Новыя формы і спосабы лячэння ўспрымаюцца як пацыентамі, так і ўрачамі даволі складана, — адзначае **прафесар кафедры эндакрыналогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, галоўны пазаштатны эндакрынолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Ала ШАПЯЛЬКЕВІЧ.** — Калісьці пацыенты былі катэгарычна настроены супраць генна-інжынернага інсуліну, які ў 2010-м прыйшоў на змену свіному. Многія прадузята ставяцца да айчынных лекаў, але мы праводзілі даследаванні і ўбачылі станоўчы вынік па айчынных інсулінах і адмоўны — па некаторых выраблены за мяжой. Разам з тым частцы пацыентаў падыходзяць толькі прэпараты замежнай вытворчасці, і дзяржава забяспечвае імпартнымі аналагамі таксама.

У свеце з цукровым дыябетам жыве кожны 11-ты дарослы, а ў 2040 годзе, паводле прагнозаў, размова будзе ісці пра кожнага 10-га. У Беларусі пражывае каля 287 тысяч такіх хворых, і штогод іх колькасць прырастае на 8—10 працэнтаў. Вялікай праблемай застаецца значная колькасць людзей, якія трапляюць у поле зроку ўрачоў вельмі позна. **Еўрапейскія эксперты перакананыя, што да 40 працэнтаў людзей з дыябетам жывуць, не здагадваючыся аб захворванні.** Між тым магчымасці для ранняга выяўлення захворвання ёсць — рэгулярныя медагляды і аналіз крыві на глюкозу або на глікіраваны гемаглабін. Для гэтага не трэба шукаць эндакрынолага, а дастаткова візіту да ўрача-тэрапеўта або ўрача агульнай практыкі ■

■ Псіхалогія для ўсіх

## ХОБІ ПАЗБАВІЦЬ ТРЫВОГІ

**Хобі-тэрапія становіцца распаўсюджаным спосабам лячэння. Любімая справа адцягвае ад мітусні, дае магчымасць праявіць творчы патэнцыял, зняць напружанне, палепшыць эмацыянальны стан.**

— Размова не ідзе пра чытанне бестселераў або прагляд тэлевізара, — гэта якраз наадварот, нараджае пачуццё непаўнацэннасці і ўнутранай пустэчы, можа нават узмацніць дэпрэсію, — тлумачыць **урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Іна ЦЕЛЕШ.** — Станоўчы ўплыў аказвае... рукадзелле. Калі чалавек укладвае энергію ва ўзаемадзеянне з іншым чалавекам, музычным інструментам, мальбертам, то нібы становіцца часткай сістэмы — большай, чым яго індывідуальнасць. І гэта зніжае трывогу, якая назапашваецца штодня. Даўно даказана, што рукадзелле знімае стрэс, дапамагае пазбавіцца псіхалагічнага напружання, аднаўляе нервовую сістэму. Акрамя таго, заняткі, якія патрабуюць канцэнтрацыі ўвагі і ўключаюць дробную маторыку, прымушаюць працаваць наш мозг, што папярэджвае развіццё зніжэння інтэлекту, хваробу Альцгеймера.

Вязанне на спіцах, кручком, вышыванне, шыццё, бісерапляценне — усё гэта яшчэ і паляпшае стан пры захворваннях нырак і сардэчна-сасудзістай сістэмы, пазбаўляе галаўнога болю і бяссонніцы, спрыяльна адбіваецца на рабоце сасудаў, дыхальнай сістэме, нармалізуе абмен рэчываў.

Звярніце ўвагу і на некаторыя новыя віды хобі. Квілінг, або папераскручванне, — стварэнне кампазіцый з дапамогай скручаных палосак каляровай паперы. Фелтынг — стварэнне сумак, шаляў, галаўных убораў, дэкор адзення з дапамогай спецыяльных інструментаў і шэрсці. Дэкупаж — тэхніка дэкарыравання, якая дазваляе ўпрыгожыць практычна любую паверхню (керамікі, дрэва, шкла і інш.). Пэчворк — сшыванне розных па колеры і фактуры кавалачкаў тканіны. Карвінг — мастацтва фігурнай нарэзкі гародніны і фруктаў (стала модным нават дарыць «букеты» і фруктовыя карзіны, выраблены ў гэтай тэхніцы). Асвоіць усё гэта можна з дапамогай бясплатных курсаў, якія няцяжка знайсці ў інтэрнэце ■

■ Доктар адкажа

## Баляць суставы? Можа, інфекцыя...

*«Падкажыце, калі ласка, ці можа артрыт быць звязаны з хламідыйнай інфекцыяй?*

**Алеся**, *г. Мінск».*



Тлумачыць **урач-дэрматавенеролаг 24-й гарадской паліклінікі спецмедаглядаў Настасся АРЛОВА:**

— Пашкоджанне суставаў, якое ўзнікла пасля перанесенай інфекцыі, называецца рэактыўным артрытам. Развіваецца ён далёка не ва ўсіх. Часцей у генетычна схільных людзей, якія маюць ген HLA B27. Існуюць, напрыклад, энтэрагенныя артрыты, якія выклікаюць кішэчныя мікраарганізмы — шыгелы, іерсініі, кампілабактар і сальманелы. Ад іх аднолькава пакутуюць і мужчыны, і жанчыны. Аднак асаблівае месца займаюць артрыты ўрагенітальныя — ганакокавы і хвароба Рэйтэра. Ганакокавы сустракаецца ў 0,5—2% людзей, якія перанеслі ганарэю. Часцей у жанчын, бо інфекцыя нярэдка працякае без сімптомаў і своечасова не лечыцца. Хвароба Рэйтэра, якая пашкоджвае мочапалавую сістэму, суставы і вочы, выклікаецца хламідыяй, што перадаецца палавым шляхам. Часцей пакутуюць 20—40 гадовыя мужчыны. Першыя прыкметы захворвання развіваюцца праз 3—4 тыдні пасля заражэння венерычнай інфекцыяй: пачашчанае мочаспусканне з болем і смыленнем; пачырваненне вачэй, слёзацячэнне; боль, пачырваненне і ацёчнасць суставаў ног, рук, пазваночніка; павышэнне тэмпературы; патаўшчэнне скуры на далонях і падэшве; пашкоджванне слізістай ротавай поласці; могуць быць нават адхіленні ў рабоце сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм.

У такім выпадку патрабуецца кансультацыя рэўматолага, уролага (гінеколага) або дэрматавенеролага. Давядзецца здаць аналізы крыві (назіраецца павышэнне колькасці лейкацытаў, павелічэнне хуткасці асядання эрытрацытаў) і мачы (тут таксама будзе павышаны паказчык лейкацытаў). Урач павінен разабрацца з рэўматоідным фактарам, вызначыць антыген HLA-B27, даследаваць матэрыял слізістай урэтры або цэрвікальнага канала, паказана і рэнтгенаграма суставаў.

Галоўная мэта ў лячэнні — барацьба з хламідыёзам з дапамогай антыбактэрыяльных прэпаратаў (да 4 тыдняў без перапынку). Для змяншэння болю ў суставах прызначаюцца супрацьзапаленчыя сродкі, ін'екцыі гармонаў (да 6 месяцаў). Паказана і фізіятэрапія.

Кожны трэці пацыент вылечваецца цягам паўгода, і хвароба не з'яўляецца зноў, у іншых яна пераходзіць у хранічную форму з магчымымі рэцыдывамі, а ў 5 працэнтаў пацыентаў могуць назірацца сур'ёзныя змяненні ў суставах.

Такім чынам, пры з'яўленні частага мочаспускання, непрыемных адчуванняў ва ўрэтры неабходна тэрмінова звяртацца да ўролага, гінеколага або дэрматавенеролага. Трэба пазбягаць выпадковых палавых кантактаў, карыстацца прэзерватывам, а калі кантакт меў месца, звяртацца да ўрача для здачы аналізаў на інфекцыі ■

■ Група рызыкі

# СЛАБАЕ МЕСЦА ДУЖАГА ПОЛУ

## ШТО АДБІРАЕ Ў НАШЫХ МУЖЧЫН 10 ГАДОЎ ЖЫЦЦЯ?

**Пачынаючы з 1990-х спецыялісты пачалі звяртаць увагу на значна меншую працягласць жыцця нашых мужчын у параўнанні з жанчынамі. Сёння размова ідзе пра розніцу ў 10—11 гадоў. У Еўропе гэты разрыў таксама ёсць, аднак размова ідзе ўсяго пра 3—4 гады. Летась меркаваная працягласць жыцця ў мужчын склала 68,6 года, у жанчын — 78,9. Сваімі думкамі адносна сітуацыі дзеляцца кардыёлаг, уролаг і псіхіятр.**




Фота БЕЛТА.

**Намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія», кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр ПАЦЕЕЎ:**

— Захворванні сістэмы кровазвароту ў мужчын сустракаюцца вельмі часта. За 35 гадоў колькасць хворых вырасла ў 35 разоў. З аднаго боку, больш распаўсюджанымі сталі фактары рызыкі, а з другога — палепшыліся дыягнастычныя магчымасці медыцыны. Колькасць выпадкаў інфаркту міякарда ў апошнія гады зніжаецца, але пераважна сярод жанчын і за выключэннем узроставай групы пасля 70-ці. Агульная смяротнасць ад інфаркту знізілася за 20 гадоў на 3 працэнты, у працаздольным узросце — на 14 працэнтаў. У цэлым мужчыны працаздольнага ўзросту гінуць значна часцей за жанчын. Летась ва ўзросце 50—55 гадоў розніца смяротнасці ад інфаркту міякарда сярод мужчын і жанчын склала 9,6 раза.

> **«Бясшкодных доз алкаголю не існуе, таму што гэта арганічны растваральнік, які губіць клеткі любога органа».**

Сярод фактараў рызыкі па страце гадоў, звязаных з інваліднасцю і ранняй смяротнасцю ў мужчын, на першым месцы — злоўжыванне алкаголем, далей ідуць тытунёвая залежнасць, павышаны артэрыяльны ціск, высокі ўзровень халестэрыну, недастатковае ўжыванне фруктаў і агародніны, атлусценне, нізкая фізічная актыўнасць. Дарэчы, для таго каб дакладна ведаць аб распаўсюджанасці фактараў рызыкі ў краіне, Міністэрствам аховы здароўя сумесна з Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя праводзіцца маштабнае даследаванне STEPS. Калі б нам удалося выдаліць, напрыклад, ужыванне алкаголю, то адно гэта адразу знізіла б смяротнасць сярод мужчын на чвэрць. Што да курэння, то вопыт яго забароны ў грамадскіх месцах у еўрапейскіх краінах забяспечыў зніжэнне захваральнасці на інфаркт міякарда на 17 працэнтаў усяго праз шэсць месяцаў пасля прыняцця рашэння. Мы, кардыёлагі, падтрымліваем любыя меры па забароне, зніжэнні ўжывання алкаголю і тытуню.

> **«Ранняе выяўленне раку прастаты дазваляе мужчыне нармальна жыць на працягу пятнаццаці гадоў».**

Недастатковая фізічная актыўнасць згубна адбіваецца на рабоце сэрца і сасудаў, а сёння мы бачым катастрафічнае распаўсюджанне гіпадынаміі. Яшчэ пакаленне таму назад у падлеткаў фізічная актыўнасць была дастатковай, чаго не скажаш пра дзень сённяшні. Нельга скідваць з рахункаў і фактары знешняга ўздзеяння — якасць паветра і вады ў першую чаргу, і ад гэтага наша здароўе залежыць ажно на 7 працэнтаў. Гэта вялікі паказчык, але тут патрэбны комплексны падыход, а не толькі і не столькі намаганні канкрэтнага чалавека, здольнага самастойна адкарэкціраваць уласны лад жыцця.

**Загадчык кафедры ўралогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, галоўны пазаштатны ўролаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр СТРОЦКІ:**




— Ад уралагічнай паталогіі пакутуе, вядома, менш мужчын, чым ад інфаркту. Аднак гаварыць пра нізкую смяротнасць ад уралагічных захворванняў не выпадае, таму што свой шкодны ўнёсак у гэту справу робіць рак прастаты — гэта другое па распаўсюджанасці ў мужчын анкалагічнае захворванне. Для паляпшэння ранняга выяўлення гэтага віду раку цягам апошніх трох гадоў у Салігорску, Мінску і Маладзечне мы праводзім скрынінг — абследуем здаровых мужчын ва ўзросце пасля 50-ці. Паводле папярэдніх вынікаў, захворванне на ранніх стадыях пачало выяўляцца ў два разы часцей. Ёсць намер зрабіць скрынінг агульнарэспубліканскім. Ранняе выяўленне раку прастаты дазваляе мужчыне нармальна жыць на працягу пятнаццаці гадоў.

Пра здароўе мужчынам трэба пачынаць думаць не тады, калі ім спаўняецца 60. Пачынаць варта ад моманту зачацця. Нездарма, напрыклад, двойчы падчас цяжарнасці жанчына абследуецца на выяўленне парокаў развіцця плода. А кожны трэці парок развіцця — гэта паталогія мочапалавой сістэмы, і распаўсюджана яна ў большай ступені сярод хлопчыкаў. Далей, у падлеткавым узросце, нармальнае фізіялагічнае развіццё павінны адсочваць эндакрынолагі. Калі тут будуць праблемы, гэта пацягне за сабой і праблемы псіхалагічнага, сацыяльнага кшталту. Ёсць у сучасных мужчын і праблема з плоднасцю. У кожнай дзясятай пары ўзнікаюць праблемы з зачаццем. Пры гэтым на 45 працэнтаў бясплоднасць пары абумоўлена здароўем жанчыны, яшчэ на 45 — здароўем мужчыны і на 10 працэнтаў — абаіх. У найбліжэйшы час плануецца распрацаваць новыя падыходы да вырашэння праблемы бясплоднасці.

Ад 18 да 50 гадоў нашы пацыенты хварэюць пераважна на запаленчыя захворванні. 40—60 працэнтаў мужчын да 50 гадоў маюць праявы прастатыту. І ў першую чаргу гэта праблема мужчын, якія мала рухаюцца і шмат сядзяць. Застойным з'явам у органах малога тазу спрые, дарэчы, і злоўжыванне алкаголем. Мы кажам нашым пацыентам аб шкодзе вялікіх доз таго ж каньяку і іншых моцнаградусных напояў, але ці чуюць яны нас?

Крыху часцей у мужчын у параўнанні з жанчынамі сустракаецца мочакаменная хвароба, але сёння для яе лячэння адкрытыя аперацыі прымяняюцца толькі ў 6—8 працэнтах выпадкаў, ва ўсіх астатніх праблема вырашаецца шляхам эндаскапіі або прымяняецца дыстанцыйнае здрабненне.

З узростам у мужчын развіваецца дабраякасная гіперплазія прастаты, або адэнома. Гэта не паталогія, а нармальнае пастарэнне арганізма. 75 працэнтаў выпадкаў адэномы прастаты не падлягаюць ні медыкаментознаму, ні хірургічнаму лячэнню. Астатнія лечацца пераважна медыкаментамі, якія дазваляюць зняць сімптомы, і толькі 12—14 працэнтаў пацыентаў аперыруюцца, у тым ліку эндаскапічным метадам.

Штогод мужчына ва ўзросце пасля 30 гадоў страчвае каля 2 працэнтаў узроўню тэстастэрону, і да 50 гадоў прыкладна палова мужчын мае праблемы з патэнцыяй. Грубыя парушэнні сустракаюцца толькі ў 5 працэнтаў, сярэднія — у 15-ці, у астатніх — лёгкія. Адна справа, калі парушэнне эрэкцыльнай функцыі ўзнікае ў сталым узросце, і зусім іншая — у сярэднім. Запомніце, шаноўныя мужчыны, што гэта ёсць грубае парушэнне рэжыму працы і адпачынку. Нельга працаваць 24 гадзіны ў суткі і пяць гадоў запар без перапынку. Любая праца павінна чаргавацца з адпачынкам, вучыцеся правільна арганізоўваць працоўную дзейнасць. Нават мужчына з самым высокім узроўнем тэстастэрону аднойчы стане заложнікам гэтай праблемы, калі не будзе пераключацца, не перастане сядзець па начах за камп'ютарам.



**Намеснік дырэктара па медыцынскай часці Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Сяргей ОСІПЧЫК:**

— Гармон тэстастэрон робіць мужчын больш схільнымі да рызыкоўных паводзін. За кошт істотнай долі нечаканай смяротнасці ў працаздольным узросце — тут і дарожна-транспартныя здарэнні, і суіцыды, і спажыванне ал-



каголю — агульная смяротнасць сярод мужчын і атрымліваецца вышэйшая... Некаторыя прадстаўнікі дужага полу аказваюцца сёння ў дзіўнай для сябе ролі — застаюцца, напрыклад, даглядаць дзіця, а жонка тым часам працуе. Нехта сутыкаецца з праблемай вызначэння сваёй ролі, не можа зразумець, што адбываецца, і пачынае збягаць ад рэальнасці з дапамогай алкаголю. У больш як палове выпадкаў заўчаснай гібелі напярэдадні мае месца злоўжыванне спіртным. Сусветная арганізацыя аховы здароўя фарміруе ўжо паняцце «алкагалізму ўікенду», калі ў выхадныя чалавек спажывае празмерную дозу градусных напояў.

Бясшкодных доз алкаголю не існуе, таму што гэта арганічны растваральнік, які губіць клеткі любога органа. Дзякуючы добрым адаптацыйным механізмам арганізма, алкаголь ператраўліваецца, аднак прадукты яго перапрацоўкі шко-

> **«Летась ва ўзросце 50—55 гадоў розніца смяротнасці ад інфаркту міякарда сярод мужчын і жанчын склала 9,6 раза».**

дзяць здароўю. Моцныя напоі наогул павінны адысці ўбок, аднак і на віно не варта налягаць. Яго пазітыўны эфект для здароўя абумоўлены антыаксідантамі — тым жа рэсвератролам. Дык ці не лепей у такім выпадку проста ўжываць вінаград?

Мы дасягнулі за апошнія гады зніжэння ўзроўню ўжывання алкаголю на душу насельніцтва да 9,5 л, хоць гэта па-ранейшаму досыць высокі паказчык. У нас ужо дзейнічаюць пэўныя абмежаванні доступу да алкаголю, аднак неабходна яшчэ фарміраваць паводзіны, скіраваныя на захаванне здароўя, — сустрэча павінна быць не за выпіўкай, а на спартыўнай пляцоўцы. І гэта шлях, па якім ідуць многія краіны. У Швецыі, напрыклад, фактычна няма затрымання кіроўцаў у стане алкагольнага ап'янення, як няма і фактаў гібелі ў выніку кіравання аўтамабілем нападпітку.

Мужчыны інача рэагуюць на стрэс і не так, як жанчыны, спрабуюць з ім спраўляцца. Жанчыны могуць пазбавіцца сваёй экспрэсіі ў час размоў з сяброўкамі, а мужчыны, наадварот, эмацыянальныя інтраверты — не схільныя гаварыць аб сваіх праблемах, імкнуцца не заўважаць свае балячкі, іх пазіцыя — «я вып'ю, і ўсё пройдзе». А вось у дэпрэсіі мужчына можа стаць больш агрэсіўным, схільным да авантурных паводзін. Таму дужы пол трэба навучаць гаварыць аб сваіх праблемах. З'явілася бяссонніца — трэба не за каньяк брацца, бо нічым добрым гэта не скончыцца, а ісці да псіхатэрапеўта, які ёсць ужо ў кожнай паліклініцы ■

■ Візіт да стаматолага

## БЕЛЫЯ-БЕЛЫЯ



**Колер зубоў звязаны з колерам цвёрдых тканак, што знаходзяцца пад эмаллю, сама ж эмаль празрыстая. Жоўтыя, шэрыя, аранжавыя, чырванаватыя адценні — усё залежыць ад нашай генетыкі. Беласнежных зубоў у прыродзе, дарэчы, не бывае.**

Колер эмалі не звязаны з устойлівасцю да карыесу. У больш светлай разбурэнні такія ж частыя, як і ў жоўтай. У паверхневы слой эмалі пранікаюць розныя фарбавальнікі з ягад, кары, буракоў, чаю, кавы, чырвонага віна, паўплываць можа і ўжыванне лекавых прэпаратаў — антыбіётыкаў, прэпаратаў жалеза. Уплывае курэнне, дрэнная гігіена ротавай поласці.

— Усе метады адбельвання — хатняе, офіснае, камбінаванае — заснаваныя на выкарыстанні хімічных прэпаратаў, — расказвае **загадчыца стаматалагічнага платнага аддзялення 4-й гарадской клінічнай стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Алена ВЯЧЭРСКАЯ.** — Гэта растворы перакісу вадароду, перакісу карбаміду, якія забяспечваюць акісленне пігментаў у зубе. У хатніх умовах адбельванне адбываецца з дапамогай капаў — пласцін на зубы, у якія закладваецца адбельваючы раствор. Пласціны вырабляе доктар па індывідуальным злепку зубоў.

Офіснае адбельванне праходзіць у кабінеце ўрача, калі дадаткова выкарыстоўваюць спецыяльныя лямпы, лазер. Прымяняюцца тут растворы з большай канцэнтрацыяй перакісу, чым у хатніх умовах. Гэты метад больш дарагі, тут патрабуецца некалькі наведванняў, сам жа эфект не такі стабільны. Таму магчыма спалучэнне гэтых методык.

Усе віды адбельвання могуць правакаваць адчувальнасць зубоў. Але гэта праходзіць па завяршэнні курса адбельвання. Звычайна ўрач падказвае, як пераадолець гэту непрыемную з'яву. Усе сучасныя метады адбельвання бяспечныя, калі праводзяцца пад кантролем урача. Пры гэтым не адбываецца нейкіх значных змяненняў цвёрдасці эмалі ці яе хімічнага складу.

Праз год пасля адбельвання новае адценне захоўваецца ў 90%, праз 3 гады ў 62%, праз 7 — у 35%. Зыходны колер, як правіла, ужо не вяртаецца.

Абсалютным проціпаказаннем з'яўляецца цяжарнасць, груднае кармленне і ўзрост да 16 гадоў, але ёсць і адносныя проціпаказанні: карыес, захворванні дзясны і слізістай абалонкі ротавай поласці, дрэнная гігіена, вялікая колькасць пломбаў і каронак... Дарэчы, пломбы і штучныя каронкі не адбельваюцца, таму калі зрабіць адбельванне пры вялікіх пломбах, то пасля спатрэбіцца іх замена.

У любым выпадку пра ўсё гэта раскажа падчас кансультацыі стаматолаг. Большасць урачоў не рэкамендуюць самастойна набываць і выкарыстоўваць сістэмы для адбельвання ■

Матэрыялы падрыхтавала
Святлана БАРЫСЕНКА. protas@zviazda.by

алімпіец
ЗВЯЗДА
ВЫПУСК № 11 (48)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



■ Нечакана

# Алімпійскі агонь у Токіа запаліць аўтамабіль

**Прымаючы летнія Алімпійскія гульні ў 2020 годзе, Японія вырашыла здзівіць свет сваімі тэхнічнымі распрацоўкамі. Менавіта таму, як піша news.com.au, плануецца запаліць алімпійскі агонь пры дапамозе лятаючай машыны.**

Згодна з планам, аўтамабіль спачатку праедзе па стадыёне, а затым узнімецца і ўжо ў паветры запаліць алімпійскі агонь. Стварылі лятаючую машыну інжынеры з Start-up Cartivator.

Нагадаем, за права прыняць у сябе Алімпіяду Японія змагалася са Стамбулам і Мадрыдам. Можна сказаць, што Токіа выйграў гэтае права трэці раз: упершыню сталіца Японіі павінна была правесці Алімпійскія гульні ў 1940 годзе, аднак яны былі адменены з-за прычыны распачатай Другой сусветнай вайны. Такім чынам, упершыню Токіа стаў алімпійскім горадам толькі ў 1964-м. Акрамя летняй Алімпіяды, краіна двойчы праводзіла зімовыя Гульні — у Сапара (1972 год) і ў Нагана (1998 год).

У тым, што японцы зробяць усё, каб правесці Алімпіяду-2020 бліскуча, няма ніякіх сумненняў. Для гэтага ў іх ёсць і фінансы, і маса тэхнічных магчымасцяў.

Алімпіяда-2020 будзе адрозніваціца яшчэ і тым, што на ёй з'явяцца адразу пяць новых відаў спорту. У Алімпійскую праграму ўключылі бейсбол (для мужчын) і аналаг гэтага віду спорту софтбол (для жанчын). Акрамя іх, мы ўбачым каратэ, скейтборд, спартыўнае скалалажанне і сёрфінг

■ Запрашальнік

## У змаганні за пуцёўку

**Ці трапіць жаночая гандбольная зборная на планетарнае першынство?**

Гэтым разам здабыць пропуск на чэмпіянат свету беларускія дзяўчаты паспрабуюць на дамашняй пляцоўцы. Пры родных балельшчыках і моцнай падтрымцы, спадзяёмся, зрабіць ім гэта будзе нашмат прасцей. Кваліфікацыйны турнір пройдзе з 2 па 4 снежня ў палацы спорту «Уручча».

Наша каманда пад кіраўніцтвам Томажа Чатэра прыступіла да падрыхтоўкі яшчэ 21 лістапада. Акрамя трэніровачных заняткаў дзяўчаты паспелі правесці дзве таварыскія сустрэчы. Спачатку беларускі ўпэўнена правялі матч са зборнай Літвы — 31:25, а затым абыгралі і зборную беларускіх клубаў — 33:26.

За пуцёўку на чэмпіянат свету 2017 года ў Германію нашай зборнай трэба будзе пазмагацца са зборнымі Турцыі (2 снежня 17.00), Швейцарыі (3 снежня 15.00) і Косава (4 снежня 14.00).

Адзначым, што ў фінальнай стадыі чэмпіянатаў свету беларуская жаночая зборная апошні раз удзельнічала аж у 1999 годзе, тады наша каманда заняла 14 месца. На чэмпіянаце Еўропы апошні раз беларускі выступалі ў 2008 годзе, дзе былі 12-мі

■ Ці ведалі?

## Беларускія спартсмены, якія ўвайшлі ў сусветную гісторыю спорту

✓ Гімнаст Віталь Шчэрба з'яўляецца рэкардсменам па колькасці алімпійскіх медалёў, заваяваных за 1 дзень. 2 жніўня 1992 года ён заваяваў 4 залатыя алімпійскія медалі. Усяго ж на яго рахунку 10 алімпійскіх узнагарод: 6 залатых, атрыманых на Алімпійскіх гульнях-1992 у Барселоне, і 4 бронзавыя, выйграныя ў Атланце-1996.

✓ Ураджэнка Беларусі, чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка Вольга Корбут першай выканала ўнікальны элемент, які атрымаў назву «пятля Корбут». Падчас яго гімнастка ўстае на высокую частку брусоў і робіць сальта назад, чапляючыся рукамі за верхнюю перакладзіну брусоў. Зараз на афіцыйных спаборніцтвах гэты элемент забаронены з-за сваёй высокай траўманебяспечнасці.

✓ На Алімпійскіх гульнях у Афінах (2004 год) Юлія Несцярэнка сенсацыйна выйграла залаты медаль у бегу на 100 метраў, атрымаўшы пасля мянушку Белая маланка. Адзначым, што з 1984 года пераможцамі ў гэтай дысцыпліне станавіліся толькі цемнаскурыя спартсменкі.

✓ Сяргей Рутэнка — лепшы гандбаліст сучаснай Беларусі. Шасціразовы пераможца Лігі чэмпіёнаў. Летам 2009 года спартсмен перайшоў у іспанскую Барселону, падпісаўшы з каталонскім клубам кантракт на 5 гадоў. Сума трансферу склала рэкордныя для сусветнага гандбола (на той час) 1,2 млн еўра. За выдатныя спартыўныя дасягненні ў верасні 2016 года Сяргей удастоены ганаровага звання «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь».

✓ Сяргей Ляховіч, па мянушцы Белы воўк, стаў першым баксёрам з постсавецкай прасторы, хто змог заваяваць тытул чэмпіёна свету сярод прафесіяналаў у суперцяжкай вазе. 1 красавіка 2006 года Сяргей перамог па ачках чэмпіёна свету ў цяжкай вазе па версіі WBO Леймана Брустара

■ Змена

# ПЕРААДОЛЬВАЮЧЫ БАР'ЕРЫ

## Як дзяўчына з Пінска перамагла Ямайку і ЗША

**Эльвіра Герман крок за крокам набліжаецца да эліты лёгкай атлетыкі і ўжо лічыцца адной з самых перспектыўных спартсменак краіны. Яе рух наперад пачаўся традыцыйна — з юніёрскіх стартаў. На чэмпіянаце свету ў Польшчы сёлета дзяўчына заваявала «золата», апярэдзіўшы спартсменак-аднагодак з краін, якія прынята лічыць самымі паспяховымі ў бегу на кароткія дыстанцыі — Ямайкі і ЗША. Гэта не першы поспех Эльвіры, год таму ў Швецыі яна заваявала званне чэмпіёнкі Еўропы сярод юніёраў на аналагічнай дыстанцыі — 100 метраў з бар'ерамі. Сёння Герман ужо ўваходзіць у дарослую нацыянальную каманду і рыхтуецца да адказных стартаў, у яе планах і Алімпійскія гульні ў Токіа.**




***— Эльвіра, у сваім юным узросце ты ўжо чэмпіёнка свету і Еўропы сярод аднагодак. Адчуваеш сябе «зоркай»?***

— Дакладна не. Гэтыя поспехі сталі для мяне вельмі нечаканымі, доўга я не магла паверыць у тое, што ў мяне атрымалася дасягнуць вышынь, пра якія я так марыла і да якіх доўга ішла. Хоць і была праведзена вялікая работа, але не чакала, што змагу перамагчы. Калі ехала на юніёрскі чэмпіянат свету, практычна на 100 працэнтаў была ўпэўнена, што там мне нічога не свеціць, бо саперніцы былі вельмі моцныя, з добрымі вынікамі ў сезоне. Сябрам і родным казала, каб не разлічвалі на многае, але яны ўсё роўна за мяне балелі.

А што датычыцца «зорнасці», дык я, напэўна, і да гэтага часу не магу ўсвядоміць, што чэмпіёнка. Можа быць, таму што выразна разумею — наперадзе яшчэ шмат работы і вынікі, якія я паказваю цяпер, — гэта далёка не мяжа маіх магчымасцяў.

***— Сёння ты ўжо член нацыянальнай каманды і чакаюць, напэўна, ад цябе ўжо зусім іншага?***

— Так, я прайшла атэстацыю — гэта такі своеасаблівы пропуск у галоўную каманду. Трэнерскі штаб і кіраўніцтва разлічваюць на мяне ў выступленні праз 4 гады на Алімпіядзе-2020. Таму яны будуць укладваць у мяне ўсё па максімуме, ну а мне, у сваю чаргу, трэба паказваць усё лепшыя вынікі. Вядома, гэта адказнасць і, напэўна, крыху хвалююся, але я ўжо спрабавала сябе на стартах сярод дарослых. Летам удзельнічала ў чэмпіянаце Еўропы ў Амстэрдаме. Прабілася ў паўфінал і заняла 16-е месца, у прынцыпе, нармальны вынік для пачатку, а галоўнае, я атрымала вопыт, таму што адна справа, калі ты сапернічаеш са сваімі аднагодкамі, і зусім іншая, калі бяжыш з лепшымі спартсменкамі кантынента. Ды і атмасфера зусім іншая. Мне з дарослымі змагацца спадабалася нашмат больш: вышэй канкурэнцыя, больш адрэналіну, гэта падганяе, стараешся бегчы яшчэ хутчэй. Напэўна, ужо час пераходзіць на новы ўзровень.

***— Як правіла, маладыя спартсмены хвалююцца нашмат больш вопытных. Як з гэтым спраўляешся?***

— Лічу, што прафесійны спартсмен не павінен дазваляць сабе хвалявацца. А тым больш не павінен дапускаць, каб падобныя рэчы ўплывалі на яго вынік. Перад стартам трэба думаць толькі пра сваю справу, калі я станаўлюся ў калодку, думкі толькі пра тое, як павінна пераадолець кожны бар'ер, наколькі хутка прайсці дыстанцыю.

***— Што важней у тваім відзе спорту — хуткасць або тэхніка?***

— Гэта дзве рэчы, якія важныя ў роўных прапорцыях. У мяне пакуль хуткасць не такая, як хацелася б, а вось з тэхнікай справы куды лепш. Бар'еры я пераадольваю хутчэй, чым іншыя дзяўчаты. Зараз мы з трэнерам працуем над стартавым спрынтам. У нашым відзе важна ўсё ў сукупнасці, і сумяшчаць гэта, вядома, не заўсёды лёгка.

***— Самі бар'еры не палохаюць? Часта даводзіцца бачыць, як дзяўчаты чапляюцца за іх, падаюць ...***

— Гэта насамрэч так. Нядаўна вось нават алімпійская чэмпіёнка Салі Пірсан спатыкнулася, упала і зламала руку. У нас бываюць траўмы, як і ва ўсіх відах спорту. Вялікая нагрузка ідзе на пазваночнік у паяснічным аддзеле, многія спартсменкі пакутуюць ад гэтага, але спорт — гэта выбар кожнага. У дзяцінстве хадзіла і на танцы, і на плаванне, і на баскетбол, можа быць, яны былі б больш бяспечнымі, але я абрала лёгкую атлетыку. Заўсёды хацелася паспрабаваць менавіта бег з бар'ерамі, але мой першы трэнер — Аляксандр Аляксеевіч Сінкевіч, не хацеў мяне туды пускаць. Баяўся, што я маленькая, магу зачапіць бар'ер, упасці. Адзін раз усё ж здаўся і дазволіў. Я так удала прабегла, што стала займацца менавіта гэтым відам лёгкай атлетыкі, так усё і пачалося.

***— Са сваёй старэйшай і больш тытулаванай калегай Алінай Талай сябруеш?***

— Перасякаемся толькі на зборах. Перажывала за Аліну на Алімпіядзе. Крыўдна, вядома, што яна збіла бар'ер, калі б не гэтая памылка, то трапіла б у фінал, і я нават упэўненая, што месца на п'едэстале яна заняла б.

***— Расці ў яе цені складана ці, наадварот?***

— У СМІ пра мяне кажуць не так шмат, як пра Аліну, і гэта абсалютна справядліва. Наогул мая мама любіць паўтараць адну фразу: «Цішыня любіць чэмпіёнаў», таму тое, што мне надаюць не так шмат увагі, не хвалюе, а нават наадварот.

***— Хто сёння твае самыя сур'ёзныя канкурэнткі?***

— У маім узросце ў Беларусі — віцяблянка Руслана Рашкаван. У нас з ёй вельмі добрая канкурэнцыя, якая дапамагае абедзвюм расці, паляпшаць свае вынікі. У свеце гэта, вядома, спартсменкі з ЗША і Ямайкі, цяпер з'явілася моцная дзяўчына з Нігерыі. Ужо ўсе прывыклі да таго, што цемнаскурыя атлеткі вельмі моцныя ў спорце, дзе трэба паказваць высокую хуткасць. Кажуць, што ў іх вельмі добрая генетыка, іншая будова цела, можа быць, і ў трэніровачным працэсе ёсць нейкія сакрэты. Да таго ж калі браць афрыканскія краіны, то ўзровень жыцця там ніжэй, чым, напрыклад, у Еўропе, і гэта дае дадатковы стымул дамагчыся высокага выніку ў спорце, як правіла, у іх вельмі моцны характар. Але і мы сёння ў сілах дагнаць лідараў.

***— Існуе меркаванне, што спартсменам прыходзіцца шмат чым ахвяраваць у звычайным жыцці.***

— Паўтаруся, мы ж самі выбіраем такі лад жыцця, таму, чаго скардзіцца? Да таго ж не сказала б, што даводзіцца чымсьці ўжо моцна ахвяраваць. Можа, у мяне менш вольнага часу, чым у маіх сяброў, якія не займаюцца спортам. Але пасля трэніровак і сіл асабліва няма, каб гуляць, таму такое жаданне ўзнікае не часта. Для мяне лепш пасядзець дома, паспаць, пачытаць. Хатняя атмасфера ўвогуле падабаецца больш. Сёлета я паступіла ў БДУФК на завочнае аддзяленне па спецыяльнасці трэнер-выкладчык. Пакуль ніякіх складанасцяў з вучобай не адчуваю — сесія пачынаецца толькі ў студзені. Ці змагу стаць трэнерам, пакуль сказаць складана, усё можа памяняцца, але вышэйшая адукацыя — гэта заўсёды добра.

**«Перад стартам трэба думаць толькі пра сваю справу».**

***— Што можна знайсці сярод тваіх кніг?***

— У асноўным я аддаю перавагу раманам. Зараз чытаю «Над зязюліным гняздом» Кена Кізі, да гэтага былі «Знесеныя ветрам» Маргарэт Мітчэл, «Гонар і перакананне» Джэйн Осцін. У планах яшчэ прачытаць «451 градус па Фарэнгейце» і «Ганну Карэніну».

***— Сама ты з Пінска. Як правінцыяльную дзяўчыну прыняла сталіца?***

— У Мінску жыву ўжо чацвёрты год, у інтэрнаце. Адразу ў гэтым вялікім горадзе адчувала сябе нязвыкла, а цяпер тут мне нават падабаецца. У Пінску таксама бываю, праўда, не вельмі часта. Родны горад па-ранейшаму застаецца вельмі цёплым і ўтульным для мяне, заўсёды прыемна туды прыязджаць.

***— Да старту сезона яшчэ шмат часу, чым плануеш займацца?***

— Цяпер трэніруюся, рыхтуюся да спаборніцтваў, якія адбудуцца ўжо ў наступным годзе. Бліжэйшыя сур'ёзныя старты, у якіх планую прыняць удзел, — гэта чэмпіянат Еўропы ў памяшканні сярод дарослых, ён пройдзе ў сакавіку 2017 года. Потым, спадзяюся, буду ўдзельнічаць у маладзёжным чэмпіянаце Еўропы і ў дарослым чэмпіянаце свету. Гэта, мабыць, будуць самыя важныя турніры для мяне ў наступным сезоне

■ Легенды спорту

# «З МУЖАМ МЯНЕ АБ'ЯДНАЛА НЕ ТОЛЬКІ КАХАННЕ, АЛЕ І ЛЮБОЎ ДА БІЯТЛОНА»

## Трое дзяцей, тры адукацыі і медалі чэмпіянатаў свету: Вольга Назарава пра тое, як быць паспяховай у спорце і сям'і

**Гэтую экс-біятланістку мы ведаем, як добрую, стабільную і яркую спартсменку, яна на працягу доўгіх гадоў была неад'емным звяном нашай жаночай зборнай. Неаднаразовая медалістка чэмпіянатаў свету і ўдзельніца Алімпіяд толькі на некаторы час знікала з поля зроку біятлонных прыхільнікаў — двойчы на працягу спартыўнай кар'еры Вольга сыходзіла ў дэкрэт і двойчы пасля вярталася на лыжню. Вярталася нават тады, калі ў гэты «камбэк» ніхто не верыў. На старце новага біятлоннага сезона ў інтэрв'ю карэспандэнту «Звязды» Вольга расказвае, чаго ёй каштаваў гэты шлях і ў чым яна знайшла сябе пасля спорту.**



### Як запалілася яе «зорка»

*Вольга Назарава нарадзілася ў Расіі, у сям'і біятлонных трэнераў. Але гэтая акалічнасць зусім не азначала, што дзяўчыну ў спорце чакаюць вялікія поспехі. Аказваецца, што мы наогул маглі не ведаць Вольгу як біятланістку, калі б не адна гонка, якая вырашыла яе далейшы лёс.*

— Першая мая перамога стала адпраўной кропкай у працяглай кар'еры, *— з усмешкай успамінае Вольга*. — Я тады была яшчэ маладой дзяўчынай, юніёркай, і ў мяне вельмі дрэнна ішла стральба. Лыжны ход добры, а вось промахі падводзілі пастаянна. Пры тым настолькі падводзілі, што праз 4 гады заняткаў я ўжо страціла надзею і не верыла, што з мяне можа атрымацца добрая біятланістка.

Памятаю, трапіла на юніёрскі чэмпіянат свету апошнім нумарам, можна сказаць, ускочыла ў апошні вагон. Трэнеры далі шанц, паставілі на індывідуальную гонку, я там стала 6-й. Думаю, напэўна, гэта мой максімум і можна ўжо заканчваць са спортам. Раптам настаўнікі ставяць мяне яшчэ і на спрынт. Бегла яго як апошні раз, вельмі расслаблена. Прыйшла на першы агнявы рубеж — страляю «на нуль», думала мая «любімая» стойка ўсё расставіць на свае месцы. Прыходжу і закрываю ўсе мішэні. Нечакана. Гэта была першая ў маім жыцці перамога, якая паказала, што не варта апускаць рукі нават у такіх працяглых перыядах няўдач.

*Пазней Вольга ўжо выступала за нашу краіну, і яе вынікі пачалі толькі расці, Назарава стала чэмпіёнкай Еўропы, двойчы бронзавым прызёрам чэмпіянатаў свету і шматразовай чэмпіёнкай свету па летнім біятлоне.*

— Мой спартыўны шлях быў даволі працяглым, і, можа, ён у нейкія перыяды не здаваўся такім паспяховым, але за гэтыя гады я атрымала бясцэнны вопыт. Мне пашчасціла патрэніравацца ў розных камандах, пад кіраўніцтвам трэнераў з рознымі поглядамі на трэніровачны працэс. Часам было няпроста, асабліва ў апошнія гады, даводзілася сябе літаральна ламаць, пераглядаць свае каштоўнасныя арыенціры і ўстаноўкі, падстройвацца пад запыт новых трэніровачных умоў. Тым не менш я ўдзячная лёсу, што ў жыцці ў мяне быў такі яркі, насычаны, доўгі спартыўны шлях, ён пакінуў у душы толькі самыя цёплыя, трапяткія ўспаміны.

*Вядома, як і для кожнага спартсмена, асобна ў біяграфіі Вольгі стаяць галоўныя старты — Алімпійскія гульні.*

— Для мяне яны заўсёды былі асаблівымі спаборніцтвамі, са сваёй моцнай энергетыкай, са сваёй унутранай атмасферай, якая прымушае спартсмена адпавядаць. Менавіта на Гульнях у Турыне і Солт-Лэйк-Сіці я паказала свае лепшыя вынікі.

### «Дрым Цім», якую пашчасціла бачыць

*Падчас кар'еры Вольгі наша жаночая біятлонная каманда рэгулярна была сярод лідараў сусветнага біятлона. Акрамя Назаравай у зборнай дастойна сябе паказалі Алена Зубрылава, Кацярына Іванова, Людміла Ананька, Людміла Калінчык. У той час наша эстафетная чацвёрка практычна заўсёды была «ў прызах» на элітных спаборніцтвах.*

— Тыя гады ўспамінаю з усмешкай. У камандзе заўсёды была вельмі добрая атмасфера, нягледзячы на тое, што ўсе дзяўчаты са сваімі характарамі. Дзесьці маглі паспрачацца, адстаяць свой пункт гледжання, падтрымаць адна адну ў складаны перыяд. А недзе па-добраму папляткарыць і пажартаваць. Захоўвалася атмасфера сям'і з шчырасцю пачуццяў і прыняццем іншых людзей такімі, якія яны ёсць. Што да эстафет, то тут, вядома, усе збіраліся, як адзінае цэлае і змагаліся заўсёды да канца.

Шмат кур'ёзаў здаралася з Кацярынай Івановай, яна ў нас дзяўчына экспрэсіўная. Любіла часам ускладніць сабе жыццё.

Перадалімпійскі сезон, Турын, абкатваем наш склад на Алімпійскую эстафету. Каця, як правіла, бегла першы этап, а астатнія тры чалавекі з хваляваннем глядзелі, ці ўсё там у яе ў парадку. Бачым, Іванова выходзіць са стартавай паляны адной з першых, лежачы страляе «на нуль», праходзіць другі круг, стоячы таксама ўсё закрывае, хоць і бярэ дадатковыя патроны. Ідзе на фінішны круг на добрай пазіцыі, мы з палёгкай уздыхаем, што ў Каці ўсё склалася ўдала, і тут паказваюць на вялікім экране стадыёна, як наша Іванова літаральна кулём ляціць на спуску і пры падзенні ламае ложа вінтоўкі. Глядзім на трэнера і па выразе яго твару разумеем — гонка «склалася».

Але Каця баец з моцным характарам, паколькі вінтоўка ў яе на плячах ужо не трымалася, яна паўтара кіламетра везла яе ў руцэ. Адметна, што, нягледзячы на ўсе складанасці, наша каманда ў гэтай эстафеце стала бронзавым прызёрам і паказала на сваім прыкладзе, што змагацца трэба да канца.

### Сям'я як крыніца

*Пасля свайго пераезда ў Беларусь Вольга выйшла замуж, нарадзіла дзіця і працягнула спартыўную кар'еру.*

— Можна сказаць, што Беларусь аб'яднала нас з мужам не толькі каханнем, але і любоўю да біятлона. Кінуўшы ўсё ў Расіі, я паехала за сваім каханым, які працаваў тут.

Для мяне заўсёды галоўнай каштоўнасцю і рухальным матывам у жыцці была сям'я. Таму замужжа стала першым крокам да таго, што я здабыла спакой і ўпэўненасць у сваіх сілах. Пасля цалкам змагла прысвяціць сябе спорту, з галавой акунулася ў работу. Муж заўсёды падтрымліваў у гэтым плане. Бацькі-трэнеры ўсе свае нерэалізаваныя мары бачылі ўва мне і таксама імкнуліся дапамагчы. Мая сям'я была крыніцай сіл і галоўным натхняльнікам.

Пасля першых родаў атрымалася хутка вярнуцца ў спорт, таму што на працягу цяжарнасці была магчымасць падтрымліваць сябе ў форме. Праз паўгода пасля родаў ужо была на добрым узроўні, на летнім чэмпіянаце свету заваявала медаль, праблем не было. А вось з другой цяжарнасцю склалася ўсё інакш. Па медыцынскіх паказаннях спачатку мне прыйшлося практычна адмовіцца ад фізічных нагрузак, акрамя лёгкай хады. Пасля гэтага спатрэбіўся больш працяглы аднаўленчы перыяд, і гэта, напэўна, быў самы складаны момант у маёй кар'еры. Я прыкладала шмат намаганняў, трэніравалася значна больш, чым да дэкрэта, а выніку не было і год, і два, і тры. Усе казалі, што мне пара заканчваць, і толькі муж верыў, што не варта апускаць рукі.



Уся сям'я Вольгі Назаравай у зборы.

### Навучыцца жыць без...

*Яшчэ на працягу некалькіх гадоў пасля нараджэння другога дзіцяці Вольга працягвала сваю кар'еру і скончыла яе толькі ў 2011 годзе.*

— Гэта было ўсвядомленае рашэнне, я разумела, што ўжо не вярнуся на той узровень, з якога сышла. На той момант у мяне ўжо было двое дзяцей, таму адаптацыю да жыцця без спорту я прайшла хутка і без асаблівых складанасцяў. Да таго ж арганізм за апошнія гады так моцна стаміўся, што фізічнай нагрузкі не хацелася ўвогуле, таму гады два я проста аднаўлялася.

*Не тыпова для спорту, але адукацыю Вольга пачала атрымліваць яшчэ будучы біятланісткай і была, напэўна, адной з самых эрудзіраваных жанчын (яшчэ і маці) у гэтым відзе спорту.*

— Гэта заслуга маіх бацькоў, якія яшчэ ў дзяцінстве навучылі рацыянальна выкарыстоўваць час. У юным узросце вырашыла не паступаць у вучылішча алімпійскага рэзерву, а пайсці ў педагагічны каледж. Вучылася на вочным, усе пропускі з-за трэніровак і збораў добрасумленна адпрацоўвала. Потым у Цюмені паступіла ў юрыдычны інстытут, тры гады вучылася там, хадзіла ў форме, маршыравала на пляцы, усё як мае быць. А потым перавялася ў Мінск і ўжо тут атрымала юрыдычную адукацыю. Пазней яшчэ асвоіла эканамічную спецыяльнасць і скончыла Вышэйшую школу трэнераў.

*Усе гэтыя веды наўрад ці аддалілі яе ад спорту. Нават наадварот дапамагаюць сёння адчуваць сябе добрым спецыялістам. Зараз Вольга працуе ў федэрацыі біятлона па праграме пошуку і адбору перспектыўных дзяцей, а акрамя гэтага ў яе жыцці з'явілася любімае захапленне.*

— Мая цяперашняя работа звязана з пытаннямі, якія датычацца дзіцячага спорту і работы з рэзервам нацыянальнай каманды. Безумоўна, у нас ёсць таленавітыя і перспектыўныя дзеці, але ёсць і пэўнага роду праблемы з самой сістэмай падрыхтоўкі юных спартсменаў, пачынаючы з асноў, з пачатковых прыступак развіцця.

Што датычыцца майго захаплення, я чалавек markdownразнабаковы, і яшчэ з дзяцінства ў мяне застаўся нерэалізаваны творчы складнік. Калі была ў спорце, на зборах магла вязаць, вышываць, маляваць — гэта было рэлаксацыяй, спосабам настроіцца на гонку і зняць залішняе напружанне. А потым у маім жыцці з'явілася фатаграфія. Я скончыла курсы і паступова стала развівацца ў гэтым кірунку. Сёння, думаю, я ўжо фатограф добрага ўзроўню. Падабаецца ўсё, што тычыцца эмацыянальнасці фатаграфіі, для мяне важна злавіць момант шчырых сапраўдных эмоцый, паказаць менавіта тую сваю ўнікальную прыгажосць, якая прысутнічае ў кожным чалавеку.

*Як і раней, галоўнай каштоўнасцю для Вольгі сёння з'яўляецца сям'я. У былой спартсменкі ўжо трое дзяцей. Сын Кірыл прафесійна займаецца біятлонам і ўжо робіць пэўныя поспехі. Сярэдняя дачка Дар'я танцуе і малюе, ну а маленькая Таірыя пакуль цалкам атрымлівае асалоду ад дзяцінства і на працягу ўсёй нашай размовы спакойна спіць у мамы на руках.*




### Пра вяртанне Дар'і Домрачавай

*Завяршаем нашу гутарку яшчэ адной цікавай тэмай. Сумяшчаць сям'ю і спорт нядаўна вырашыла яшчэ адна наша біятлонная «зорка».*

— Даша ўжо адбылася як вялікая спартсменка і маці. Вядома, цяпер у яе няпросты перыяд у жыцці, таму што даводзіцца сумяшчаць вяртанне ў спорт з клопатам пра маленькае дзіця, але ў яе вельмі вялікая матывацыя — вярнуцца на лыжню і парадаваць нас сваімі вынікамі. У гэтай сітуацыі ёй патрэбны толькі наша падтрымка і ўпэўненасць у тым, што ўсё атрымаецца.

Як паказвае практыка, калі з'яўляецца дзіця, спартсмен адчувае вялікі эмацыянальны ўсплёск, настолькі яркая падзея ў жыцці надае дадатковыя сілы і жаданне вярнуцца на ранейшы ўзровень, а часам паказаць вынікі, якіх не было дагэтуль. У нас ужо ёсць такія прыклады — Ліў-Грэтэ Пуарэ, Мары Дарэн-Абер. Чаму ж Дар'і не працягнуць гэты спіс?

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

ПРИГЛАШЕНИЕ

**Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс «ОЛИМПИЙСКИЙ»**

# ПРОВОДИТ АУКЦИОН №114 ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИЗОЛИРОВАННОГО НЕЖИЛОГО ПОМЕЩЕНИЯ СРОКОМ НА ТРИ ГОДА

| | Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения | Площадь, м² | Начальная цена продажи до деноминации | Начальная цена продажи после деноминации |
|---|---|---|---|---|
| | **г. Минск, пр-т Независимости, 80А** | | | |
| 1 | Изолированное нежилое помещение № 9 на 2 этаже (под офис) | 12,8 | 435 200 | 43,52 |
| 2 | Изолированное нежилое помещение № 7 на 2 этаже (под офис) | 9,6 | 326 400 | 32,64 |

**Аукцион состоится «04» января 2017 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по «03» января 2017 года до 17.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

**Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок: (017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11. Интернет: www.dvs.by.**

**Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на **расчетный счет 3012208250015, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, МФО 153001964, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для облуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5»**

## Жилой дом № 2 по генплану
## ДОЛЕВОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО НА КОММЕРЧЕСКОЙ ОСНОВЕ

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ:**

Закрытое акционерное общество «Совавто Инвест»; место нахождения: г. Минск, ул. Сурганова, дом 61, помещение 81; режим работы: с 09.00 до 17.30. Обеденный перерыв: с 13.00 до 13.30. Выходные дни: суббота и воскресенье. Общество зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 28.03.2011 за № 191445853. Застройщик принимал участие в строительстве жилого дома № 3 по генплану в составе объекта «Группа многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения для облуживания населения по ул. Олешева со сносом административных, производственных, складских зданий и сооружений по ул. Олешева, 5». Фактические сроки строительства жилого дома № 3 по генплану: 07.12.2015–13.07.2016.

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА:**

1. Цели строительства: **возведение многоквартирного жилого дома**; этапы и сроки реализации: **возведение в один этап в срок по 26.09.2017**; получено положительное заключение государственной экспертизы **от 29.02.2016 № 72-15/16**.

2. Сведения о месте нахождения объекта строительства и его характеристики, в том числе сведения о количестве объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров, сведения о ценах на объекты долевого строительства и условия их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке: **1-подъездный 19-этажный крупнопанельный 126-квартирный жилой дом № 2 по генплану в изделиях серии М111-90 по ул. Олешева в г. Минске.**

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются следующие квартиры по указанным ниже ценам:

